Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 4 к.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 70 к. „ 3 „ 1 р. — к. „ 6 „ 4 р. — к. „ 1 год 7 р. — к. Змена адрасу: іншагародняя—20 к. місцовыя —10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шапкаралі пасля тэксту — р. 50 к. За радок шапкаралі наперад тэксту 1 р. — к. За радок шапкаралі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпешныя ня 50 проц. дарожай. Зашы тарыфу бярэцца 10 проц. малогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумент . . . .35 кап. За кожны дадатковы . . .15 „ Беспрадоўн. і чырвонаармейцы за дакумент . . . .15 „ За кожны дадатковы . . . 5 „ Публікацыі ЗАГС'а—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.

АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

8-ы ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 161 (2053) Аўторак, 19-га ліпеня 1927 г.

КРЫВАВЫЯ ПАДЗЕІ У ВЕНЕ.

РАБОЧЫЯ ІНШЫХ ГАРАДОЎ АЎСТРЫІ ПАДТРЫМЛІВАЮЦЬ РАБОЧЫХ ВЕНЫ.

САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫ ІМКНУЦЦА ЎСІМІ СРОДКАМІ ПРЫДУШЫЦЬ РУХ.

Заняцьце паліцыяй памяшканьня ЦК аўстрыйскай кампартыі і арышты камуністаў.

ІТАЛІЯ І ВЭНГРЫЯ ЗГОДНЫ ДАПАМАГЧЫ АЎСТРЫЙСКАМУ УРАДУ ВАЙСКОВАЮ СІЛАЮ.

Венскі пралетарыят на барыкадах.

У Вене—сталіцы Аўстрыі—адбылося масавае выступленьне рабочых. Трыста тысяч рабочых фабрык і заводаў выступілі на вуліцу, каб пратэставаць супроць судзебнага прыгавару, які апраўдаў фашыстаў, якія забілі ў канцы студзеня гэтага году двух рабочых ў Шатэндорфе.

З пачатку здаецца нават крыху незразумелым, чаму ў Аўстрыі, здаецца, на зусім нязначнаму выпадку неспадзявана выбухла масавае выступленьне рабочых. Буржуазны суд заўжды судзіў рэвалюцыянэраў і апраўдваў манархістаў і фашыстаў. У капіталістычных краінах ў любы дзень учыняецца белы крывавы тэрор над рабочай клясай. Чаму як-раз гэты прыгавор выклікаў гэткае абурэньне працоўных?

Што падрыхтавала гэткія напуджаныя абставіны ў Аўстрыі, якую гэтак нядаўна сацыял-фашысцкі старац Карл Каўцкі рэкамэндаваў як вузор «сапраўднай дэмакратыі і сацыялізму?!» Як гэта здарылася на бацькаўшчыне «левага» тэарэтыка II інтэрнацыяналу Отто Бауэра?

Нават афіцыйнае паведамленьне аўстрыйскага ўраду гаворыць аб падзвычайным становішчы, растрэлах і кулямётах. На дэмадстрацыю рабочых урад, які карыстаецца падтрыманьнем Отто Бауэра адказаў кулямётным агнём. Сацыял-дэмакратычныя дружыны абароны забіваюць рабочых і наладжваюць «парадак».

Аўстрыя находзіцца пад кіраўніцтвам англа-амэрыканскага капіталу. Ужо тры гады, як Аўстрыя перажывае гаспадарчы крызыс. Беспрацоўе дасягнула калізарных разьмераў. Уся краіна стогне ад падаткаў. Нават дробная буржуазея і тая нездаволена сучасным рэжымам. Фінансава-эканамічны кантроль вызначаны буйнейшымі капіталістычнымі дзяржавамі, падарваў народную гаспадарку краіны.

На глебе цяжкага эканамічнага становішча расьце і пашыраецца клясавая барацьба. Аўстрыйская буржуазея і ўрад карыстаюцца поўным падтрыманьнем сацыял-дэмакратаў. Сац.-дэмакратычная партыя здаволена пастановай фашысцкага суда. Масы страцілі веру ў здрадніцкія прафсаюзы, у сацыял-здрадніцкую партыю. Масы зразумелі, што Бауэр падтрымлівае фашыстаў. Праз галовы прафсаюзаў і сацыял-дэмакратычнай партыі масы накінуліся на буржуазею. Рабочыя пачалі рабаваць суд, захапляць паліцэйскія вучасткі, зброю, зьбіваць жандараў і адразу кінуліся ў парлямэнт. Калі стыхійнае выступленьне мас зьнішчае ўсе перашкоды пачынаецца перарастаньне яго ў рэвалюцыйны рух, тагды сацыял-дэмакраты прыходзяць выратаваць буржуазею. Зараз Отто Бауэр разам з фашыстамі абдумывае плян прыдушэньня рабочага паўстаньня.

Масы аўстрыйскіх рабочых выходзяць з пад уплыву сацыял-дэмакратаў. Дарма буржуазея спадзяецца, што здрадніцкі з II інтэрнацыяналу яе выратуюць. Масы выходзяць на вуліцу каб змагацца са сваім клясавым ворагам—буржуазнай дзяржавай.

У рабочай клясе сабралося досыць гаручага матар'ялу. Досыць кінуць іскру, каб выбухла паўстаньне. Дробны выпадак выцягнуў рабочых на вуліцу і яны рашылі ўзяцца за зброю. Няхай гэта памятуюць падпальшчыкі вайны. Тое, што адбылося ў Аўстрыі вельмі сымптаматычна. Хто скажа, як адкажа нямецкі, ангельскі і францускі пралетарыят, калі распачнецца вайна?!

Правадыры ідуць управа і зьліваюцца з фашыстамі. Масы ідуць улева і супроць сваіх правадыроў.

Мы яшчэ ня ведаем усіх падрабязнасьцяй выступленьня аўстрыйскага пралетарыяту. Адно для нас ясна, што гэткія выступленьні ня могуць прайсьці бяз ніякіх вынікаў. Могуць, зразумела, выступленьне разграміць, але яно навучае рабочых заваёўваць салідарнасьць у вулічнай барацьбе на барыкадах.

Сацыял-дэмакратычныя негадзяі асуджаюць гэты «нелёйяльны», крок рабочых, будуць буржуазе і даказваць, што сацыял-дэмакратыя толькі за парляманцкія мэтады вайны. Мы-ж ведаем, што рабочая кляса зможа заваёўваць свае правы і абараніць сябе ад фізычнага зьнішчэньня толькі ў барацьбе супроць сацыял-дэмакратыі. Аўстрыйская кампартыя ня можа застацца ў баку падзей. Калі масы стыхійна выступілі, яна павінна іх весьці ў бой нават, калі добра вядома, што гэты рух будзе пераможаны. Кампартыя павінна быць заўсёды з масамі, асабліва, калі масы выступаюць і бяруцца за зброю.

Паведамляюць, што Вэнгрыя і Італія зьбіраюцца паслаць свае войска для прыдушэньня паўстаньня. Магчыма, што ў буржуазнай Эўропе знойдуцца і напэўна знойдуцца сілы для прыдушэньня аўстрыйскага паўстаньня. Міжнародны рэвалюцыйны пралетарыят **не павінен дапусьціць да разгрому аўстрыйскіх рабочых і ўсімі сродкамі павінен прыйсьці ім на дапамогу.**

Падзеі ў Вене зьяўляюцца грозным напамінам для імпэрыялістаў аб тым, в якім **тылам** ім прыдзецца мець справу, калі яны кінуцца на адкрытую барацьбу в СССР.

Становішча ў Вене.

ПРАГА, 16-7. Тэлеграфныя зносіны з Венаю яшчэ ў поўдзень былі перарваны. Аднак, у Прагу прышоў сёньня раніцой начны поезд з Вены. Паведамленьні прыехаўшых на гэтым поезьдзе блытаныя. Аднак, цьвёрда ўстаноўлена, што паліцыя ў поўнач трымала цэнтр гораду.

Рабочыя масамі зьбіраюцца ў акопіцах і накіроўваюцца да цэнтру гораду. Памяшканьне суду згарэла.

На некаторых вуліцах пабудаваны барыкады, якія робяць зносіны на гэтых вуліцах немагчымымі. Кіруючыя колы сацыял-дэмакратыі, бясспрэчна, выказваюцца «проці непарадкаў» і стаяць за супрацоўніцтва з паліцыяй. Цэнтральны камітэт сацыял-дэмакратычнай партыі абвясьціў пэрманэнтнае пасяджэньне. Аднак, да гэтага часу ніякіх дырэктыў і лёзунгаў ЦК не абвясьціў. За тое ЦК пасылае Отто Бауэра і Зэйца да Зэйпеля з патрабаваньнем ад адстаўцы ўраду і аб выводзе паліцыі і войска з занятых імі вуліц. Буржуазныя газэты сёньня ня выйшлі.

Аўстрыйскі консул у Братыславе толькі-што перадаў па тэлефону ў аўстрыйскую місію ў Прагу, што ў выніку падзей становішча Зэйпеля ня моцнае, і што Зэйпель склікае нараду дыплёматычнага корпусу.

Братыслаўскія карэспандэнты прасскіх газэт паведамляюць, што Шуцбунд устанавіў на аўстрыйскай мяжы сыстэму прапускоў бяз якіх нельга перайсьці мяжу.

Як паведамляюць, сур'ёзныя стычкі між рабочымі і паліцэйскімі адбываюцца апроч цэнтру яшчэ ў 2-х райёнах, дзе забіта 3 паліцэйскіх. Надаслана паведамленьне, што некарыя венскія банкі перасялі каштоўныя паперы ў Братыславу.

Зноў стычкі.

ПРАГА, 18-VII. Аўстрыйскае агэнцтва паведамляе, што ў суботу ноччу паліцыі ўдалося аднавіць парадак у Вене. Калі паліцыя разганяла апошнія дэманстрацыі ў райёнах справа ізноў дайшла да стычкі. У нядзелю ў Вене—зусім спакойна. Газэты, апроч інфармацыйнага бюлетэню сацыял-дэмакратычнай партыі, ня выйшлі. Інфармацыйны бюлетэнь зьмяшчае на бачным месцы адозву ЦК сацыял-дэмакратычнай партыі і ЦК прафсаюзаў. Вуліцы былі перапоўнены цікаўнымі асобамі. Доступ у памяшканьне суду зачынены. Памяшканьне абкружана паліцэйскім кардонам. Шматлікія атрэды пажарных у працягу раніцы ў нядзелю здолелі ліквідаваць пажар у памяшканьні суду.

Арганізаваны абшчынная ахова.

ПРАГА, 17-VII. Згодна аўстрыйскага ўрадавага паведамленьня, апроч 2-х забітых паліцэйскіх і аднаго забітага служачага крымінальнай паліцыі, было нижка параненых звыш 100 супрацоўнікаў паліцыі. З боку дэманстрантаў было ня менш 40 забітых і больш 300 параненых. Улада арыштавала 252 асобы. Проці іх узьнята крымінальнае прасьледваньне. Бургмістр Вены Зэйц арганізаваў абшчынную ахову і катэгарычна растлумачыў, што гэта новая узброеная арганізацыя будзе існаваць толькі на час неадхіленай яшчэ небясьпекі новых непакояў, і што супрацоўніцтва абшчынной аховы з органамі дзяржаўнай паліцыі будзе забясьпечана. Пытаньне аб часе скліку парляманту абмяркоўваецца ўрадам з лідэрамі палітычных партый. Урад абумоўлівае склік парляманту спыненьнем забастоўкі рабочых транспарту і сувязі.

Чакаюць зьмены ў складзе ўраду.

БЭРЛІН, 16-7. Згодна апошніх атрыманых праз Братыславу вестак, не зважаючы на пануючы сёньня ў Вене адносны спакой, ва ўрадавых і буржуазных колах Вены в вялікім непакоем чакаюць заўтрашняга дню, калі ў Вену, як відаць, прыдуць накіраваныя туды з усіх больш-менш блізкіх месц рабочыя масы. У процівагу гэтаму ў Вене згрупоўваюцца сябры «Саюзу абароны» з пэрагу аўстрыйскіх гарадоў.

Водлуг чутак, чакаюцца буйныя зьмены ў складзе ўраду.

Сацыял-дэм. хочуць прыдушыць рух.

БЭРЛІН, 16-VII. Венскі карэспандэнт газэты «Вольт-Ак-Абэнд» паведамляе з Прэзбургу (Братыслава), што ўсеагульная забастоўка ахапіла ўсю Аўстрыю. З усіх больш-менш буйных гарадоў надыходзяць паведамленьні, што выступленьне рабочых у Вене ўзьняло ўсюды рабочых на ногі, наперакор волі афіцыйных лідэраў рабочага руху. У Грацы, Клягенк-Фарта, Ліцы адбыліся вялікія маніфэстацыі. Рабочыя патрабуюць адстаўкі ўраду Зэйпеля, прыдушэньне фашызму і ўтварэньне рабочага ўраду. У Бургенляндзе згрупоўваюцца часьці рэспубліканскага Шуцбунду (саюз абароны), на чале з сацыял-дэмакратамі. Водлуг чутак, вэнгерскі ўрад загадаў згрупаваць войска на аўстра-вэнгерскай граніцы каля Эдэнбургу. Настрой рабочых баядзёры, незважаючы на ўчарайшыя ахвяры. Сацыял дэмакратычная партыя выступіла з лёзунгам усеагульнай забастоўкі, як відаць, **з мэтаю ўзяць у свае рукі кіраўніцтва рухам і прыдушыць яго.** Усё-жткі наўрад ці ўдасца сацыял-дэмакратам прыдушыць надобны масавы рух і захаваць ранейшы лад.

* * *

ПРАГА, 17-7. ЦК сацыял-дэмакратычнай партыі і ЦК прафсаюзаў зьмясьціў новую адозву, у якой перасьцярагае рабочых ня даць сябе пашманаваць камуністам, якія агітуюць за неадкладнае ўзброеньне рабочай клясы. ЦК сацыял-дэмакратычнай партыі і ЦК прафсаюзаў заяўляюць: «узброеньне рабочых у сучасны момант мела-б непасрэдным вынікам дзяржаўную вайну, узброенную барацьбу між рабочай клясаю і вайсковымі групоўкамі дзяржавы. З гэтае прычыны грамадзянская вайна азначала-б, папершае, новае стрэшэннае пралітцё крыві, па другое, нячуваную эканамічную катастрофу, голад, павялічэньне беспрацоўя, патрэціе, выдачу рабочых у рукі узброенага фашызму ў аграрных райёнах, дзе сацыял-дэмакратыя слабая, па-чацьвертае, сур'ёзную небясьпеку для існаваньня рэспублікі». Адозва скончана словамі: «мы ня хочам перажыць таго, што перажылі рабочыя ў Італіі і Вэнгрыі. З гэтае прычыны мы хочам ужыць усе захады, каб уніknуць ад грамадзянскай вайны». Агалошаная сацыял-дэмакратамі ў зьвязку з падзеямі адозва, водлуг думкі некаторых рабочых колаў, зьяўляецца адзнакаю, што нават найбольш папулярныя сацыял-дэмакратычныя лідэры не зважаючы на ўсе натугі, ня здолелі падначаліць сабе рух. Адозва ацэньваецца, як надзвычайна характэрная для тактыкі сац.-дэмакратаў, разьлічанай, каб раскалоць і затрымаць разьвіцьцё руху.

Аўстрыя адрэзана.

БЭРЛІН, 17-VII. Аўстрыя ўсё яшчэ застаецца адрэзанаю ад усяго сьвету. Учора ў Вену прыляцелі толькі асобныя самалёты. У Тыролі абласны ўрад агаласіў адозву, якая заклікае спыніць забастоўку. Выхад газэт поўнасьцю спынен, апроч інфармацыйнага бюлетэню сацыял-дэмакратычнай партыі і прафсаюзаў. Весткі аб становішчы ў Аўстрыі кажуць, што сацыял-дэмакратычныя лідэры прыкладаюць усе сілы каб прыдушыць рух. Дзеля гэтага яны з аднаго боку спачуваюць паліцыі а з другога праводзяць самую шалёную кампанію проці камуністаў.

Арышты камуністаў.

ПРАГА, 17-7. Водлуг атрыманых тут з аўстрыйскай граніцы вестак, сацыял-дэмакраты ўжываюць усе захады, каб прыдушыць рух. Сацыял-дэмакратычныя лідэры выступаюць з заклікамі проці дэманстрацыі, проці «камуністычных падбухторшчыкаў» і заклікаюць да «разваг» рабочай клясы Вены. Урад адхіліў прапанову бургмістра Зейца аб замене вайсковай варты ва ўрадавых памяшканьнях паліцыяй, хоць вайсковая ўлада, што знаходзіцца ў Вене, лічыцца ненадзейнай. Водлуг чутак арыштаваны некаторыя камуністы. Як перадаюць, у Вену сьцягваюцца з правінцыі моцныя атрады сацыял дэмакратычнага Шуцбунду. Карэспандэнт «Право Ліду» паведамляе, што венская газэта «Айбэртэр Цэйтунг» канфіскавана вайсковым міністрам. «Чэске Слова» паведамляе, што «Зэйпель мае намер абвясьціць асаднае становішча. Венскі карэспандэнт «Чыкаго Трыбун» паведамляе, што дыплёматычны корпус атрымаў дазвол прывесьці чужаземнае войска для абароны чужаземных місій. Водлуг слоў карэспандэнта, магчыма, што гэты войска, у выпадку патрэбы будзе перададзена ў загад ураду для ваенных дзеяньняў проці паўстанцаў. Чэха-славацкія рэфармістыя пакуль што пакуль без адказу прапанова кампартыі Чэхаславакіі аб арганізацыі супольных дэманстрацый салідарнасьці з венскімі рабочымі, Чэскія і нямецкія сацыял-дэмакраты склікаюць у чацьверг мітынг, на якім павінны прысутнічаць таксама сацыял-дэмакратычныя прамоўцы з Вены. Орган Чэхаславацкай кампартыі, вышаў сёньня з белымі месьцінамі. Цэнзура выкінула 13 заметак і артыкулаў, у тым ліку поўнасьцю адозву ЦК кампартыі. Апошнія паведамленьні з Вены вызначаюць лічбы забітых у часе вулічных боек у Вене 150 чалавек, і параненых у 700 чалавек. Згодна гэтых паведамленьняў урад непакоіцца за новы выбух непакояў, бо ноччу на 17-е ліпеня рабочыя ўварваліся ў арсэнал і захапілі зброю.

ПАЛІЦЫЯ ЗАНЯЛА ПАМЯШКАНЬНЕ ЦК АЎСТРЫЙСКАЙ КАМПАРТЫІ.

ПРАГА, 17-VII. Згодна атрыманых тут з аўстрыйскай мяжы паведамленьняў, паліцыя заняла памяшканьне ЦК аўстрыйскай кампартыі і камсамолу. Водлуг чутак, арыштаван сэкратар партыі Панленік.

Сацыял-дэм. іншых гарадоў адхілілі прапанову камуністаў аб дэманстрацыі салідарнасьці.

ПРАГА, 17-VII. Водлуг атрыманых з аўстрыйскай граніцы вестак, забастоўка рабочых усіх галін транспарту і сувязі правоцэіцца поўнасьцю. Перавозяцца толькі харчовыя грузы. Урад выдаў шэраг суровых загадаў, у адпаведнасьці з надзвычайным становішчам. Сходы забаронены. Чужаземцы ў перапудзе ўцякаюць з Аўстрыі. Славенская газэта паведамляе, што аўстрыйскі ўрад зьвярнуўся да ўсіх суседніх урадаў з просьбаю дапамагчы войскам. Апроч таго, сацыял-дэмакраты ў іншых гарадох адхілілі прапанову камуністаў аб арганізацыі супольнай дэманстрацыі салідарнасьці.

С.-д. супроць забастоўкі.

БЭРЛІН, 16-7. Адзіная газэта, што вышла сёньня ў Вене—экстраны выпуск органу сацыял дэмакратаў—„Арбайтэр Цэйтунг». Газэта ўскладае на сацыял-дэмакратаў адказнасьць за падзеі 15-га ліпеня. Водлуг слоў «Арбайтэр Цэйтунг» прафсаюзы абвясьцілі ўсеагульную 24-х гадзінную забастоўку, пасьля якой рабочыя павінны вярнуцца на працу. Сацыял-дэмакратычная партыя прапануе рабочым ня брацъ удзелу ў дэманстрацыях і залуйле, што забастоўка—адзіная дапусьцімая форма пратэсту.

Чыгуначнікі бастуюць.

ПРАГА, 17-7. У нядзелю ўдзень у рабочых райёнах Вены адбываліся далей масавыя мітынгі; у часе вулічных дэманстрацый здарыліся стычкі, у выніку чаго ёсьць забітыя і параненыя. Бастуючыя чыгуначнікі з абурэньнем адхілілі згодніцкія спробы меншавікоў, накіраваныя да паступовага зьменшаньня забастоўкі транспарту і сувязі. Яны спынілі поезды, якія ішлі з Тыролю з вайсковаю дапамогаю. На ўсіх чыгунках і шосных прыгранічных пунктах уздоўж аўстра-чэхаславацкай і аўстра-вэнгерскай границ бастуючыя выставілі ўзброеную рабочую варту. Рабочыя ўважліва кантралюць рух па Дунаі, каб свадчасна адхіліць правакацыю з боку вэнгерскіх ці венскіх фашыстаў. Венскія рабочыя захапілі пырокавяшчальную радыё-станцыю, каб перашкодзіць распаўсюджаньню на радыё фальшывых урадавых паведамленьняў. ЦК партыі Чэхаславакіі наслаў у Вену ў якасьці свайго прадстаўніка Болена.

Рабочыя звальняюцца.

БЭРЛІН, 18 7. Прычынаю новых крывавых стычак у Вене ноччу з суботы на нядзелю зьявіўся ўваход у горад выкліканага з правінцыі армейскага батальёну. Войска, якое мела інструкцыю зараз-жа распачаць страляніну у выпадку «непарадкаў», адкрыла агонь па дэманстрантах, забіўшы 12 чалавек і параніўшы значны лік рабочых. Рэфармістам, якія выдалі ў суботу загад аб спыненьні ўсеагульнай забастоўкі і аб прадоўжаньні забастоўкі рабочых транспарту і сувязі, удалося пакуль што вярнуць на працу частку трамвайных рабочых, прычым меншасьць трамвайшчыкаў адмовілася ад аднаўленьня працы. Перад трамвайнымі дэпо адбываліся ў нядзелю раніцою бурныя сцэны: рабочыя, якія не згаджаліся спыніць забстоўку, спрабавалі забараніць вываз вагонаў з дэпо. Шмат рабочых, што адмовіліся выйсьці на працу, зволена. У выніку траўлі сацыял-дэмакратамі камуністаў ужо арыштавана 250 рабочых, у тым ліку шмат працаўнікоў аўстрыйскай кампартыі. З групы правіцыйных гарадоў паведамляецца аб вялікіх дэманстрацыях, аб мерапрыёмствах мясцовых рабочых па нагляду за дзейнасьцю фашысцкіх арганізацый і аб стычках, падрабязнасьці якіх пакуль што яшчэ невядомы. Да Вены сьцягваецца з рэакцыйных правінцый вернае ўраду войска. Абласныя ўрады прапанавалі ўраду ў выпадку патрэбы накіраваць у Вену рэакцыйныя арганізацыі франтавікоў (фашыстаў). Як перадаюць, Зэйпель раніца з чужаземнымі ўрадамі па пытаньні аб тым, якім чынам у выпадку патрэбы прывесьці войска з суседніх дзяржаў.

Патрабаваньні аўстрыйскай кампартыі.

БЭРЛІН. 16-VII. Аўстрыйская кампартыя высунула наступныя патрабаваньні: 1) неадкладны склік ўсеаўстрыйскага камітэту пры вялікіх заводзкіх камітэтах, які павінен ухваліць рэзалюцыі аб неабходнасьці палітычных мерапрыёмстваў; 2) узброеньне рабочых; 3) разброеньне паліцыі і фашысцкіх арганізацый; 4) прадоўжаньне ўсеагульнай забастоўкі; 5) утварэньне рабочага сялянскага ўраду. У суботу зранку вышаў сьпешны выпуск органу аўстрыйскай кампартыі «Ротэ Фанэ». Выхаду другога сьпешнага выпуску перашкодзілі сацыял-дэмакраты, забараніўшы падачу электрычнай энэргіі ў друкарню.

Італія і Вэнгрыя прапануюць аўстрыйскаму ўраду дапамогу.

БЭРЛІН, 16-7. Аўстрыя ўсё яшчэ зусім адрэзана ад іншага сьвету, бо тэлеграфная, тэлефонная і чыгуначная забастоўка праводзіцца поўнасьцю, нават рэйсы суднаў па Дунаю спыняюцца на аўстрыйскай мяжы. Водлуг прыватных чутак, урад Зэйпэля адмаўляецца падаць у адстаўку. Як зазначаюць бэрлінскія карэспандэнты амэрыканскіх газэт, пасланьнікі Італіі і Вэнгрыі ў Вене прапанавалі аўстрыйскаму ўраду дапамогу вэнгерскага і італьянскага войска «для аднаўленьня парадку».

Нямеччына аб венскіх падзеях.

БЭРЛІН, 15-VII. Падзеі ў Вене зрабілі вялікае ўражаньне на Нямеччыну. Правы друк усклада адказнасьць за падзеі на «марксысцкае падбухторваньне». Дэмакратычны друк зазначае на камуністаў, як на зачынішчыкаў паўстаньня. «Ротэ Фанэ» зазначае, што вялікае выступленьне венскіх рабочых у барацьбе з буржуазеяй, не зважаючы на супярэчаньне сацыял-дэмакратаў, павінна пашырыцца і скончыцца перамогаю рабочай клясы. Нямецкі пралетарыят вітае байцоў на венскіх барыкадах.

Сацыял-дэмакраты „працуюць".

БЭРЛІН, 18-VII. Апошнія весткі з Вены кажуць, што сацыял-дэмакраты ўзмоцнена працуюць над ліквідацыяй руху. Пасьля 12-цігадзіннага перапынку ўжо з учарайшага дню адноўлены узмоцненыя паветраныя зносіны з Вены па ўсіх кірунках.

ЦК с-д. партыі вядзе перамовы з урадам.

БЭРЛІН, 16-7. Толькі-што надасланыя з Братыславы весткі зацьвярджаюць, што сёньня да 11-й гадзіны раніцы ў Вене было досыць спакойна: ЦК аўстрыйскіх прафсаюзаў і ЦК рэспубліканскага Шуцбунду (саюзу абароны), якім кіруюць сацыял-дэмакраты, зьвярнуліся з заклікам да рабочых захоўваць сёньня поўны спакой у знак жалобы па ахвярах учарайшых вулічных боек. У зьвязку з гэтым сёньня было ніякіх дэманстрацый, аднак, вуліцы перапоўнены бастуючымі рабочымі, якія ходзяць невялікімі групамі. На падставе згоды між бургамістрам Зэйцам і паліцыяй, прэзыдэнт Шобэр вывеў паліцэйскія атрады з Рынгу, дзе «парадак» ахоўваецца выключна «Саюзам абароны». На заўтра прафсаюзы назначылі вялікія дэманстрацыі. У сваей адозьве прафсаюзы заклікалі да правядзеньня поўнай усеагульнай забастоўкі, у тым ліку на чыгунках, пошце і тэлеграфе. Выключэньне дапушчаецца толькі для транспарту і харчовых запасаў. Лёзунг усеагульнай забастоўкі быў поўнасьцю ажыцьцёўлены.

Між ЦК сацыял-дэмакратычнай партыі і ўрадам адбываюцца нясупынныя перамовы. Водлуг чутак, урад згадзіўся на адстаўку Шобэра, а таксама маецца на ўвазе ўтварэньне новага каліцыйнага габінэту з удзелам сацыял-дэмакратаў.

Гэраізм чырвоных франтавікоў.

БЭРЛІН, 12-VII. У часе нядаўняга разводзьдзя ў Саксоніі значную ролю ў справе дапамогі нацярпеўным адыгралі саюзы чырвоных франтавікоў і міжрабпом. Сярод ахвяр катастрофы—шмат камуністаў. Толькі ў адным Дэргінфуталі з 13-ці камуністаў, якія складалі мясцовую арганізацыю кампартыі, затанула 10 чалавек, у тым ліку 6 сяброў саюзу чырвоных франтавікоў, якія выратоўвалі рэчы іншых.

Уціск нацменшасьцяў

ВЕНА, 11-VII. Румынскі ўрад скасаваў субсыдыю школам вэнгерскай і нямецкай нацыянальных меншасьцяў. Для школ гэта раўназначна іх зачыненьню, бо без дзяржаўнай дапамогі яны існаваць ня могуць.

Італія ўзбройваецца.

РЫМ, 15-7. Водлуг вестак газэты «Імпэро», Італія намерана давесьці лік адзінак свайго паветранага флёту ў 1929 г. да 3 т. проці сучасных 1800.

Тав. Варашылаў аб „Тыдню Абароны".

МАСКВА. Варашылаў у артыкуле, прысьвечаным «Тыдню абароны» піша: «У гэтыя дні кожны рабочы, кожны селянін, кожны служачы меў магчымасьць прадумаць з чаго складаюцца яго абавязкі у адносінах да абароны СССР. Але кожны павінен прадумаць гэта пытаньне не для таго, каб заспакоіцца і забыць, а для таго, каб у сваёй штодзённай працы гэтыя абавязкі ажыцьцяўляць. Тады Чырвоная армія, узмоцненая актыўнасьцю міліённых мас працоўных здолее абараніць Савецкі Саюз ад замахаў сучасных цьвёрдалобых гаспадароў капіталістычнага сьвету, адкуль яны і калі яны ні зьявіліся-б.

У панскай Польшчы.

Нечарговая сэсія сойму.

ВАРШАВА, 16-VII. ППС і эндэкі вярнуліся да прэзыдэнта рэспублікі з асобнымі заявамі аб скліку нечарговай сэсіі сойму.

Польскі лятун ляціць у Амэрыку.

Лаўры Лінбэрга і іншых амэрыканскіх лятуноў не даюць спаць шмат каму. 21 ліпеня г. г. мае намер выляцець з Парыжу ў Нью-Ёрк і польскі лятун капітан К. Kubala з капітанам Ідзікоўскім. Яны вылецяць на двухматорным аэраплане «Lorraine-Dietrich» 600 кон. сіл.

Залескі захварэў.

ВАРШАВА, 16-VII З прычыны хваробы Залескага часова выконваючым абавязкі міністра замежных спраў назначан польскі пасланьнік у Рыме Кноль.

Забастоўка будаўнічых рабочых у Лодзі.

Ужо некалькі тыдняў цягнецца забастоўка будаўнічых рабочых у Лодзі, якая, дзякуючы наступучнасьці працадаўцоў цягнецца і далей, а таму і будаўнічы рух спыніўся і пагражае не распачацца ў гэтым сэзоне

Нямецка-польскі ўгавор аб дапамозе беспрацоўным.

БЭРЛІН, 14-VII. Агэнцтва Вольфа паведамляе: «Нямецкі і польскі ўрады ўтварылі 14-га ліпеня ўгавор, згодна якога ўрады гэтых краёў абавязваюцца даваць беспрацоўным—падданым адной з угаворных дзяржаў, якія жывуць на тэрыторыі другой дзяржавы, такую-ж дапамогу, як і сваім грамадзянам

Канфэрэнцыя лігі абароны правоў чалавека.

ПАРЫЖ, 15-VII. У Парыжы адбылася штогодняя канфэрэнцыя міжнароднай фэдэрацыі лігі абароны правоў чалавека. На канфэрэнцыі абмяркоўвалася пытаньне аб паслабленьні дэмакратыі і ўзмацненьні дыктатуры ў некаторых краёў. З нападамі проці савецкага рэжыму выступілі Аўксеняў і Загорскі. Вэнгерскі сацыяліст Сондэ ў сваёй прамове заявіў, што краі, дзе ўстаноўлен фешысцкі рэжым, перайшлі ў калёніі англа-амэрыканскага капіталу. Пры гэтым ён спасылаўся на тое, што прэса Англіі і Злучаных Штатаў заўсёды выступае ў абарону злачынстваў італьянскага, польскага і вэнгерскага фашызму. У рэзалюцыі ліга пратэстуючы проці адмены свабод, зазначае, што краі дзе ўстаноўлена дыктатура адкрыта ці захавана варожыя Лізе Нацый хоцьбы яны і ўдзельнічалі ў ёй, стваряюць пагрозу спакою. Рэзалюцыя заклікае ўсе сэкцыі лігі дамагацца аднаўленьня свабод. У другой рэзалюцыі ліга падкрэсьлівае небясьпеку, якая ўзьнікае ад ажыцьцяўленьня саюзу між рэжымамі фашысцкай дыктатуры і міжнародным фінансавым капіталам.

Станові́шча ў Кітаі.

Вобыск у шанхайскім аддзяленьні Далёка-Усходняга банку.

ШАНХАЙ, 16-VII. Сёньня раніцою памяшканьне шанхайскага аддзяленьня Далёка-Ўсходняга банку (савецкага) было абкружана атрадам муніцыпальнай паліцыі (падначаленай муніцыпалітэту міжнароднага сэтльмэнту), на чале якой знаходзіліся найбольш выдатныя чыноўнікі сыскнога аддзяленьня паліцыі і вядомыя белагвардзейцы Кедраліанскі, Рынас і Ляёбёдкін, а таксама капітан Чоу ў якасьці прадстаўніка генэрала Ян-Ху, вядомага сваімі пакараньнямі сьмерцю камуністаў і рабочых у Німбо і іншых мясцох. Увайшоўшы ў памяшканьне банку паліцыя паказала ордэр на вобыск і агляд усіх кніжак і дакумантаў; ордэр выдан кітайскім часовым судом. Паліцыя была ў памяшканьнях банку з 10-й гадзіны раніцы да 4-й гадз. дню, пры чым праз увесь час выразна хацела знайсьці ў кніжках і дакумантах банку якое-небудзь апраўданьне ўчыненага вобыску. Было абшукана ўсё памяшканьне, прычым сэйфы аглядаліся асабліва ўважліва. Паліцыя рабіла таксама выпіскі з кніг і аглядала кнігу бягучых рахункаў, не зважаючы на тое, што для гэтага патрэбны спэцыяльны дазвол судовай улады на падставе правіл аб ахове камэрцыйнай тайны. Таксама былі агледжаны нават банкаўскія тэлеграфныя шыфры, не зважаючы на рашучыя пратэсты кіраўніка шанхайскага аддзяленьня банку. А 7-й гадз. увечары паліцыя зьявілася ізноў і апячатала памяшканьне банку. Вячэрняя газэта «Мяркуры» піша, што вобыск учынен па загаду самога Чан-Кай-Шы, ці яго бліжэйшых супрацоўнікаў. Адчуваючы наперад, што вобыск ня дасьць ніякіх вынікаў, газэта піша: «пасьля таго, як у красавіку Далёка-Ўсходні банк быў у працягу некатраага часу абкружан паліцыяй,—зараз належыць шукаць усе цікавыя дакументы па Ванку Род (гэта значыць у савецкім консульстве). Генэральны консул СССР тав. Казлоўскі наведаўся да камісара нанкінскага ўраду па замежных справах правіцыі Цьзянсу і заявіў яму рашучы пратэст проці вобыскаў, падкрэсьліўшы, што супольныя выступленьні Нанкінскай улады з уладаю міжнароднага сэтльмэнту і белагвардзейцамі зьяўляюцца нячуваным фактам. Як відаць вобыск зьявіўся непасрэдным вынікам правакацыйнай траўлі з боку імпэрыялісцкіх і белагвардзейскіх газэт, у Шанхаі, якія зацьвярджаюць, нібы-та Далёка-Ўсходні Банк «субсыдуе працу камуністаў і ўханскага ўраду.

* * *

НЬЮ-ЁРК, 16-7. Шанхайскі карэспандэнт «Асошыэйтэдпрэс» паведамляе, што па загаду кітайскай улады шанхайскае аддзяленьне далёка-ўсходняга банку зачынена. Арыштаў сярод асабовага складу банку ня было. Дакументы з банку ня вывезены, але з некаторых зіх зроблены адбіткі. Водлуг слоў карэспандэнта, улада чужаземнага кварталу Шанхаю ня мае дачыненьня да наскоку.

Вобыск на кватэры кіраўніка Д-Усх. Банку.

ШАНХАЙ, 17-7. Сёньня раніцою француская паліцыя зрабіла вобыск на кватэры кіраўніка шанхайскага аддзяленьня далёка-ўсходняга банку Фронбэрга (кватэра знаходзіцца на тэрыторыі францускай канцэс,і). Апроч чыноў францускай паліцыі пры вобыску прысутнічалі расейскія белагвардзейцы. Паліцыя ня толькі абшукала памяшканьне але і зрабіла асабісты вобыск у Фронбэрга. Паліцыя ўзяла з сабою з шаф і сталоў кнігі, асабістую перапіску, фатаграфіі і г. д.

Перамовы Чжан-Цзун-Чана з Чай-Кан-

Рэзалюцыя

III-га Пленуму ЦКК КП(б)Б ад 4-7 ліпеня 1927 г.

ПА СПРАВАЗДАЧЫ ПРЭЗЫДЫУМУ ЦКК КП(б)Б.

1. Заслухаўшы даклад аб працы Прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б і адабраючы яго працу за справаздачны пэрыяд, III-ці Пленум ЦКК КП(б)Б у якасьці асноўных дасягненьняў у працы ЦКК адзначае наступнае:

а) узмацненьне сувязі з нізавымі партыйнымі арганізацыямі, рабочымі масамі, прафорганамі і шырокае асьвятленьне ў друку працы ЦКК—НК РСІ дзякуючы чаму замацавана большая ўвага рабочых мас і ўсёй партыйнай і савецкай грамадзкасьці да працы ЦКК НК РСІ;

б) найважнейшай працай, праведзенай прэзыдыумам ЦКК і НК РСІ, зьяўляецца спрашчэньне дзяржаўнага і гаспадарчага апарату БССР, палепшаньне мэтадаў працы апошніх, скарачэньне справаздачнасьці, павялічэньне правоў нізавога савецкага апарату і кіраўніцтва правядзеньнем праверкі зьніжэньня цэн; гэтыя мерапрыёмствы, даўшы станоўчыя вынікі, паслужылі штурхачом да далейшай дзейнасьці партыйных і савецкіх органаў у галіне сыстэматычнай барацьбы з бюракратызмам і мабілізавалі партыйна-савецкую грамадзкасьць навакол выкананьня гэтых найважнейшых дырэктыў партыі;

в) узмацненьне барацьбы з бюракратызмам, валакітаю і пратэкцыянізмам—як з боку дзяржаўнага і гаспадарчага апарату, так і некаторых асоб—пры адначасным далейшым узмацненьні ўцягненьня ў працу ЦКК і ў абсьледвацельскую працу НК РСІ нізавых партыйных і прафэсыянальных органаў і праз іх рабочых мас;

г) прыцягненьне і пабуджэньне дзяржаўна-гаспадарчага апарату да непасрэднага выкананьня працы па спрашчэньню і рацыяналізацыі, што забясьпечвае магчымасьць сапраўднага згрупаваньня агульнага кірунку ўсёй працы ў руках ЦКК НК РСІ;

д) узмацненьне шэрагаў партыі шляхам барацьбы і папярэджаньня антыпартыйных і нездаровых зьявішчаў у КП(б)Б.

2. Пленум ЦК КП(б)Б лічыць, што далейшае накіраваньне працы ЦКК і АКК КП(б)Б павінна ісьці па наступных асноўных лініях:

а) прадаўжаць узмацненьне сувязі з нізавымі партыйнымі і прафэсыянальнымі арганізацыямі, больш уцягваць іх у практычную працу ЦКК і АКК і праз іх рабочыя масы;

б) прадаўжаць далейшае замацаваньне ўвагі рабочых і сялянскіх мас, партыйнай і савецкай грамадзкасьці на працы ЦКК РСІ і АКК шляхам яшчэ большага асьвятленьня на масавых сходах, максымальнага выкарыстоўваньня друку для асьвятленьня работ і мерапрыёмстваў, якія праводзяцца ЦКК НК РСІ і АКК РСІ;

в) узмацніць працу на барацьбе з бюракратызмам, пратэкцыянізмам і іншымі адмоўнымі зьявамі апарату праз далейшае палепшаньне яго работы, дабіваючыся яшчэ большага ўцягваньня ў гэту працу шырокіх рабочых і сялянскіх мас, напаўняючы кіраўнічы склад апарату рабочымі і сялянамі. Узмацніць рэпрэсыўныя меры да асоб, якія працуючы ў дзярж. і гаспад. апараце, дапушчаюць бюракратычныя праяўленьні і парушэньні рэжыму эканоміі;

г) важнейшай задачай ЦКК РСІ зьяўляецца і дабіцца далейшага пашырэньня працы па рацыяналізацыі, спрашчэньні і скарачэньні апарату, зьвяртаючы асаблівую ўвагу на пытаньні рацыяналізацыі вытворчасьці, паколькі апошняе мерапрыёмства амаль не распачата належным чынам саміні ўстановамі і прадпрыёмствамі. Роля ЦКК НК РСІ ў гэтай галіне павінна быць накіравана ў бок арганізацыі і прасоўваньня гэтае працы, пагоджаньня яе паміж асобнымі зьвеньнямі апарату, непасрэдная работа па рацыяналізацыі павінна быць ускладзена на ўстановы і прадпрыёмствы;

д) адначасова весьці рашучую барацьбу па ажыцьцяўленьні рэжыму эканоміі такім чынам, каб гэта праца ў дзяржаўных і гаспадарчых органах разьвівалася ня толькі вакол асобных дробных мерапрыёмстваў, а будавалася на аснове найбольш глыбокіх карэньняў рэжыму эканоміі—рацыяналізацыі вытворчасьці і апарату, а таксама скарачэньня накладных і адміністрацыйных выдаткаў; прычым неабходна поруч з гэтым наладзіць у самых органах правіловы вучот дасягненьняў па рэжыму эканоміі, які дагэтуль мае недалікі, адначыны пастановай II-га пленуму ЦКК КП(б)Бел. ад 3-4 красавіка г. г.

3. У галіне барацьбы з бюракратызмам і за палепшаньне дзяржапарату пленум асобна адзначае рад грунтоўных хібаў і цяжкасьцяй, зьнішчэньне якіх застаецца асноўнай далейшай задачай органаў КК—РСІ, асабліва ў наступных напрамках:

а) неабходна правядзеньне упартай барацьбы з супраціўленьнем дзярж. і гаспадарчага апарату, якое яшчэ мае месца, правядзімым мерапрыёмствам ЦКК НК—РСІ, вынікаючым часта як з неразуменьня асобнымі кіраўнікамі дзярж. і гасп. апарату ролі і значэньня ЦКК—РСІ у агульнай сыстэме партыйнай і савецкае работы, гэтак і з праяў імі процістаўленьня сваіх ведамасьцевых дамыслаў правільнай лініі партыі; у выніку чаго маюцца моманты няўважлівых адносін да распаряджэньняў ЦКК—НК РСІ, павольнасьць і затрыманьне ў іх правядзеньні;

б) трэба ўзмацніць, як яўна нявыстарчаючую, працу па палепшаньні і рацыяналізацыі дзярж. і гасп. апарату самімі органамі з далейшым уцягненьнем да яе прафэсыянальных арганізацый; пры гэтым трэба рашуча адкінуць часта прыкмячаемае няправільнае разуменьне шмат якіх дзярж. і гасп. органаў, аб выключным даручэньні гэтай працы органамі РСІ.

в) З прычыны слабай самарацыяналізатарскай працы гасп. органаў, ня гледзячы на прынятыя меры з боку кіруючых органаў і дырэктывы мартаўскага пленуму ЦК КП(б)Б, зьніжэньне цэн на прамтавары праведзена неправажна мэханічна за рахунак прыбыткаў прамысловасьці і гандлёвай сеткі, а адміністрацыйныя выдаткі гасп. органаў засталіся амаль ні на папярэднім узроўні, што трэба разглядаць, як невыкананьне дырэктываў партыі. У галіне зьніжэньня цэн важнейшым заданьнем зьяўляецца—дабіцца ўтрыманьня дасягнёнага ўзроўня і давесьці рацыяналізатарскую працу да такога ўзвышша, каб можна было зьніжэньне цэн забясьпечыць перш усяго, за рахунак патаньненьня апарату тавараправодзячай сеткі, адначасова з паступовым зьніжэньнем сабекаштоўнасьці прадукцыі прамысловасьці і належыць таксама дабіцца правільнай пастаноўкі вучоту зьніжэньня цэн, якая адбівала-б сапраўдны процант зьніжэньня;

г) адзначаючы, што ўпоруч з правядзімым зьніжэньнем цэн, пытаньні палепшаньня якасьці прадукцыі набывае ўсё больш вагі, а паміж тым, маючыяся паасобныя выпадкі зьніжэньня якасьці прадукцыі адмоўна ўплываюць на рэальнасьць праробленага зьніжэньня,—Пленум ЦВК зьвяртае ўвагу гасп. органаў на узмацненьне прац па палепшаньні якасьці і ўзмацненьня кантролю за выкананьнем дырэктываў партыі і Сав. улады ў гэтай галіне;

д) як і раней адсутнічае пастаноўка сыстэматычнага кантролю з боку дзярж. і гасп. апарату па праверцы выкананьня ім як рашэньняў партыі і ўлады, так і ўласных рашэньняў, што прыводзіць да несваечасовага выкананьня пастаўленых партыяй заданьняў, аслабляе тэмп працы сав. дзяржавы і тым-самым узмацняе агульнае зло бюракратызму.

Дзеля гэтага, адным з важнейшых мерапрыёмстваў у далейшай працы ЦКК РСІ і АКК зьяўляецца кантроль і праверка выкананьня своечасовага правядзеньня пастаноў партыі і ўлады, у прыватнасьці пастаноў ЦКК РСІ, дзяржапаратам рашуча дабіваючыся, каб кожная ўстанова і прадпрыёмства паставілі самакантроль і праверку выкананьня сваіх мерапрыёмстваў і пастаноў партыі. Прычым, удзел у гэтай працы нізавых парт.,-праф. органаў, рэв. камісіі зьяўляецца асабліва важным.

4. Адзначаючы вялікую ролю друку і рабселькораў у барацьбе з бюракратызмам і іншымі недахопамі апарату, Пленум ЦКК КП(б)Б лічыць, што органам друку неабходна яшчэ больш зьвярнуць увагі барацьбе з адмоўнымі зьявамі ў дзяржаўных і гаспадарчых апаратах ЦКК НКРСІ і ў асаблівасьці АКК павінны больш засьвятляць сваю дзейнасьць у друку, садзейнічаць рабселькорам пры разаблачэньні недахватаў і ненармальнасьцяй апарату.

5. Ухваляючы меры ўзмацненьня працы Бюро Скаргаў, пленум пацьвярджае неабходнасьць такой пастаноўкі працы Бюро Скаргаў, калі яго дзейнасьць будзе цесна зьвязана з шырокімі рабочымі і сялянскімі масамі, пагэтаму, важнейшай задачай Бюро Скаргаў зьяўляецца устанаўленьне сувязі з масай шляхам дакладаў на сходах і праз друк, і шляхам забясьпечаньня хуткасьці рашэньняў з боку Бюро Скаргаў і АКК-РСІ па пададзеных скаргах.

6. Адной з важнейшых задач ЦКК і АКК зьяўляецца таксама садзейнічаньне КП(б)Б правядзеньню барацьбы за адзінства партыі і супроць апазіцыі, якая перашкаджае сваімі антыпартыйнымі выступленьнямі правядзеньню мерапрыемстваў па ўмацаваньні дыктатуры пралетарыяту, узмацненьні тэмпу індустрыялізацыі і ўзмацненьню абароназдольнасьці краіны, праводзячы рашучую барацьбу супроць апазіцыйных групіровак.

7. Як і раней, адной з грунтоўных задач ЦКК у барацьбе супроць адмоўных зьявішч сярод членаў партыі зьяўляюцца мерапрыёмствы па папярэджаньню іх шляхам своечасовага вывучэньня і выхаваньня партарганізацый і ячэек у напрамку правільнага ўжываньня мер папярэджаньня і партпакараньняў.

Выезды і разгляд характэрных спраў на мясцох, асьвятленьне перад партыйнай масай вынікаў барацьбы з балючымі зьявамі—павінны быць пашраны ў дзейнасьці АКК і ЦКК.

8. У галіне правядзеньня нацпалітыкі далейшая праца ЦКК павінна быць накіравана на праверку паглыбленьня беларусізацыі, дзяржаўнага апарату і рашучай барацьбы з усялякімі спробамі і скажэньнямі лініі партыі.

9. У адносіне да падрыхтоўкі пляну працы ЦКК НК РСІ на 1927-28 г. пленум ЦКК даручае прэзыдыуму ўлічыць вопыт пабудовы пляну працы бягучага апэрацыйнага году і, у прыватнасьці забясьпечыць своечасовасьць і большую цьвёрдасьць намечаных плянаў з тым, каб пашырэньнем плянавых пытаньняў савецкага характару не паслабляць удзел ЦКК у прапрацоўцы і вывучэньню партыйных тэм (партпраблем), правёўшы пытаньні чарговага пляну праз абгаварэньне і зацьверджаньне пленуму ЦКК КП(б)Б.

ЛІПНЁВЫЯ ПАДЗЕІ—ВЯШЧУН КАСТРЫЧНІКАВАГА ПЕРАВАРОТУ.

КРАНШТАДТ 3-га І 4-га ЛІПЕНЯ 1917 ГОДУ.

(Па матар'ялах „Арх. Кастр. Рэвал.").

3-га ліпеня, а 8-9 гадзіне ўвечары на Якарным Пляцу быў мітынг, на якім салдаты 1-га кулямётнага палка (прыехалі з Петраграду) заяўлялі, што іх полк і яшчэ шмат іншых палкоў выступаюць сёньня, і што яны пасланы ў Кранштадт прасіць дапамогі і падтрыманьня. Далей яны гаварылі, што Кранштадзкі В. К. не дазваляў ім наладзіць гэты мітынг. Пачаліся крыкі, што В. К. трэба арыштаваць.

Члены В. К. паведамілі, што яны спраўляліся па тэлефону ў Петраградзе і ім паведамілі, што весткі, перададзеныя кулямётчыкамі, няправільны. Гэта-ж паведаміў і Раскольнікаў--старшыня В. К., што па атрыманых ім ад партыі вестках выступленьне будзе.

Але кулямётчыкі зноў пачалі заклікаць да выступленьня, кажучы, што ў Петраградзе, напэўна, ужо льлецца кроў. Натоўп захваляваўся і запатрабаваў, каб В. К. узяў на сябе арганізацыю выступленьня.

Пасьля гэтага засядаў В. К. і вынес пастанову аб выступленьні. На імя начальніка ўсіх марскіх часьцей гор. Кранштату была паслана тэлефонаграма за подпісам Раскольнікава і Ррымма наступнага зьместу:

«В. К. прапануе ў 6 гадзін раніцы выйсьці са зброяй у руках і сабрацца на Якарным пляцу, а затым строга арганізаваным парадкам накіравацца ў Петраград. Разам з войскамі Петраградзкага гарнізону будзе праведзена ўзброеная дэманстрацыя пад лёзунгамі —«Уся ўлада ў рукі Савету Салдацкіх і рабочых дэпутатаў».

4-га ліпеня. Начальнік марскіх часьцей г. Кранштату разаслаў тэлефонаграму па часьцях, і на 6 гадз. на Якарным пляцу сабралася каля 5 тысяч войск. Кіравалі дэманстрацыяй Рошаль і Раскольнікаў (Ільлін).

У Петраград накіраваліся а 8-9 гадз. раніцы, высадзіліся каля Мікалаеўскага масту і пашлі да палацу Кшэсінскай. Тут з балькону гаварылі —**Ленін**, Луначарскі і інш. Ленін пачаў сваю прамову, вітаючы кранштадцаў, як «прыгоства і гордасьць расейскае рэвалюцыі».

Далей у прамовах прапанавалася ісьці да Таўрычаскага палацу і праз дэлегатаў прад'явіць патрабаваньне аб перадачы ўлады саветам.

Прывітаўшыся з гарнізонам, які насыўна адносіўся да адбываўшыхся падзей, генэрал пашоў у гарнізонны камітэт.

Тут да яго зьявіліся прадстаўнікі ад рабочых Выбаргскага райёну Куклін і Рабіновіч і папрасілі галоўнакамандуючага аб'ясьніць падзеі, якія адбываліся. Генэрал Полаўцаў падрабязна растлумачыў, як быў выкананы загад аб ачышчэньні крэпасьці і палацу Кшэсінскай.

Пасьля, задаўшы рад пытаньняў аб тым, ці будзе другі гарнізон у крэпасьці, і чым аб'ясьніць рабочым учарайшыя падзеі ў рэдакцыі «Правды» і затрыманьне т. Каменева, Куклін і Рабіновіч паехалі з крэпасьці.

У гэты час да Полаўцава зьвярнуліся кранштадцы з просьбай зараз-жа выпусьціць іх з крэпасьці і не затрымліваць праверкай.

Генэрал адказаў, што адпускае іх на «честное слово».

Матросы нарыхтаваліся выйсьці цэлымі камандамі.

Але ў гэты час некаторыя з іх заявілі, што не паедуць зараз у Кранштадт, а пойдуць адведаць сваіх знаёмых і сваякоў у Петраградзе.

Гэтага ім не дазволілі: іх пагрузілі на судны і накіравалі ў Кранштадт.

Петрапаўлаўская крэпасьць і палац Кшэсінскай.

У ноч на 6-га ліпеня галоўнакамандуючы петраградзкім ваенным акругам аддаў загад аб ачышчэньні палацу Кшэсінскай і Петрапаўлаўскай крэпасьці ад арганізацый і асоб, якія не падпарадкоўваюцца пастановам Час. Ураду.

А 3-й гадз. уночы к крэпасьці быў накіраваны запасны батальён Петраградзкага палка.

Батальёну ў дапамогу была пададзена кулямётная каманда, 1 рота сямёнаўцаў, 1 рота прэабражэнцаў, вучэбная каманда Валынскага палка і 2 гарматы.

Апроч таго, каля 9 гадзіны раніцы 6 ліпеня камандуючы бранявымі аўтамабілямі запаснага бранявога дывізіёну, якія знаходзіліся ў распараджэньні Выканаўчага Камітэту Савету Р. і С.Д. штабс-капітан Пішчэвіч атрымаў прадпісаньне дапамагаць пяхотным часьцям. Бранявы атрад, які складаўся з 8 машын, быў падзелены на дзьве часьці, прычым адна—левы флянг—накіравалася к Петрапаўлаўскай крэпасьці і к палацу Кшэсінскай, праз Дварцовы мост па Кронвэрскаму пр. на Каменавостраўскі пр., а другая часьць —праз Троіцкі мост.

У такім-жа парадку ішлі і пяхотныя часьці. Па прыбыцьці бранявікоў на рог Кронвэрскага і Каменавостраўскага пр. з Петрапаўлаўскай крэпасьці вышла дэпутацыя старога гарнізону, якая заявіла, што гарнізон крэпасьці падпарадкоўваецца Выканаўчаму Камітэту Савету Р і СД. Дэлегацыя, апроч таго, зазначыла, што 16 рота 1 кулямётнага палка, якая ўвайшла ў Петрапаўлаўскую крэпасьць, зусім лойяльна і ў працягу ўсяе ночы нясла варту ў крэпасьці, дабавіўшы, што 16 рота ўвайшла ў Петрапаўлаўскую крэпасьць іменна толькі дзеля нясеньня варты.

У момант падходу бранявікоў да палацу Кшэсінскай з яго пачалі перабягаць у Петрапаўлаўскую крэпасьць матросы і салдаты; калі-ж аўтамабіль «Бойкий» накіраваўся на перарэз перабегаўшым, то аказалася, што перабежка ўжо скончылася. Высьветлілася, што ў палацы Кшэсінскай была нязначная колькасьць людзей.

Пасьля перабежкі раздаўся невядома адкуль выстрал. З поваду гэтага салдаты бранявых аўтамабіляў напісалі запіску, у якой гаварылася, што калі страляніна зараз-жа ня будзе спынена, то бранявікі распачнуць па крэпасьці агонь. Запіска была кінута недалёка ад крэпасьці, і яе падняў матрос, вышаўшы з Петрапаўлаўскай крэпасьці.

Бранявікі «Бойкий» і «Герой» высхалі на сярэдзіну вуліцы і застанавіліся між палацам Кшэсінскай і Петрапаўлаўскай крэпасьцю. Пяхота-ж у гэты час заняла палац Кшэсінскай.

Салдаты 3 роты Петраградзкага палка, якія ўвайшлі ў палац Кшэсінскай, засталі там некалькі чалавек—штацкіх і вайсковых—і трох жанчын. Яны былі затрыманы для высьвятленьня асобы.

На прапанову здаць зброю, затрыманыя адказалі, што ў іх ёсьць толькі 23 вінтоўкі. Але салдаты ў суседніх пакоях знайшлі 6 кулямётаў Кольта, ручныя гранаты расейскага ваеннага ўзору, мноства кулямётных стужак, патронаў і зброі. У пакоях быў поўны хаос і бруд. У садзе было ўсё зроблена да абароны. У альтанцы на балоне быў устаноўлен кулямёт для абстрэлу крэпастной пляцоўкі і мосту, а ўздоўж каменнай аграды пабудаваны падмосткі для абстрэлу з вінтовак з-за сьцяны. Тут-жа знаходзілася каля дзесятку аўтамабіляў і вялікі запас бэнзіну.

Заняўшы палац, салдаты пачалі паасобна да крэпасьці. Салдаты і матросы, якія сабраліся на крэпасной сьцяне, выкацілі на вал кулямёты, выставілі ля крэпасных варот вартаўнікоў і падрыхтаваліся да абароны.

Да іх быў пасланы парляментэр з прапановай здаць крэпасьць без кравапраліцьця.

На гэта кранштадцы запатрабавалі 45 хвілін на абгаварэньне, і тут-жа на крэпасной сьцяне і ў палацы распачалася бурная нарада матросаў.

Многія матросы прапанавалі чакаць прыбыцьця дапамогі ад тых груп кранштадцаў, што разьмясьціліся ў гэту ноч у іншых вайсковых часьцях. Але большасьць стаяла за тое, каб уніknуць кравапраліцьця.

Прайшоў 45-ці мінутны тэрмін, але кранштадцы ня прышлі ні да якога выніку і папрасілі даць ім яшчэ паўгадзіны на абгаварэньне.

У гэты час прыехаў член Вык. Кам. Багданаў.

Кранштадцы ўпусьцілі яго ў крэпасьць і ён запрапанаваў ім падпарадкавацца рашэньню Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту. Кранштадцы адказалі, што яны гатовы выйсьці з крэпасьці, але папрасілі пакінуць ім зброю.

У гэтым ім адмовілі і пасьля нядоўгай нарады матросы і кулямётчыкі пастанавілі прыняць гэту ўмову.

У 11 гадзін у крэпасьць быў упушчаны грузавік, увайшло некалькі чалавек ад вайсковых часьцей, і кранштадцы пачалі здаваць зброю і патроны.

Са сьцен пачалі скочваць кулямёты і грузіць іх на аўтамабіль. Вароты былі замкнёны, каля іх паставілі патруль і некалькі афіцэраў, якія пачалі перапісваць прысутных у крэпасьці кулямётчыкаў і кранштадцаў.

Апошнія прасілі адпусьціць іх безадкладна, але ім адказалі, што з прычыны знаходжаньня сярод іх штацкіх асоб, павінна быць зроблена праверка, і да таго часу ніхто выпушчаны быць ня можа. З суровым маўчаньнем сустрэлі гэты адказ матросы.

Роўна ў 12 гадзін прыбыў батальён самакатчыкаў, а разам з імі—галоўнакамандуючы Петраградзкім вокругам.

Самакатчыкі былі расквартараваны ў палацы Кшэсінскай, ген. Полаўцаў накіраваўся ў крэпасьць.

Арышт Віктара Чарнова.

У ліку сэкратароў, якія жадалі пагаварыць з дэманстрантамі, выступіў і міністр земляробства эсэр Віктар Міхайлавіч Чарноў. Выступленьне Чарнова павяло да інцындэнту, які пазьней даў повад час. ураду абвінавачваць бальшавікоў у спробе зьвяржэньня час. ураду. Як толькі Чарноў зьявіўся ў дзьвярох Таўрычаскага палацу, яго зараз-жа акружыла група нейкіх невядомых асоб. Частка з іх была ў матроскай форме. Хто былі гэтыя людзі, ніхто ня ведаў. Тав. Троцкі дапушчае, што тут мела месца правакацыя; аднак, магчыма, што гэта былі сумленныя радавікі-матросы і рабочыя, абураныя двурушнічаствам і сабатажам час. ураду, якія ня ведалі, як выявіць сваё нязьмернае абурэньне.

Чэрноў быў выведзены на сходы пад'езду, і тут чалавек, які назваў сябе членам Пецярбургскага камітэту бальшавікоў, задаў яму два пытаньні: чаму да гэтага часу ня выданы закон аб забароне зямельных зьезлак, і чаму, ня гледзячы на пажаданьне Савету сялянскіх дэпутатаў, урад да гэтага часу ня выдаў дэкларацыі аб перадачы зямлі народу. Чэрноў, перапалоханы да апошняе ступені, бляды і дрыжачы, заявіў, што гэтыя законы яшчэ распрацоўваюцца, а што зараз яму трэба ісьці на пасяджэньне Савету. З гэтымі словамі ён зрабіў спробу ісьці, але адзін з абкружаўшых яго матросаў схапіў яго за рукі і крыкнуў: «Стой, куды ідзеш, вельмі хутка хочаш»!

Пасьля гэтага група асоб, якая абкружала Чэрнова, пацягнула яго да аўтамабіля, куды ён сеў бяз супраціўленьня. Відавочна, Чэрноў нават дрэнна ўяўляў, што з ім адбываецца, хоць пазьней ён сьцьверджаў, што сьвядома падчыніўся арыштаваўшай яго групе і нават кінуў саманадзейную фразу, што адказ за яго дасьць расейская вёска. Куды хацелі вязьці Чарнова і што думалі з ім зрабіць, невядома. Выратавалі Чарнова т. т. Раскольнікаў і Троцкі, якія выпадкова ўсё гэта ўбачылі. Стаўшы на перадок аўтамабіля, у якім сядзеў Чарноў, Троцкі сказаў невялікую прамову, у якой зазначыў недапусьцімасьць якіх-бы то ні было насільстваў над асобнымі членамі Часовага ўраду.

«Ці ня праўда, я не памыляюся,—задаў пытаньне Троцкі ў канцы сваёй прамовы,—што тут няма нікога, хто быў бы за насільства? Хто за насільства, падымеце рукі»!

Зразумела, ні адна рука не паднялася. Тады Троцкі, зьвяртаючыся да Чарнова, сказаў: «Грамадзянін Чарноў, ніхто не перашкаджае вам свабодна вярнуцца назад! Гэта было непаразуменьне»! Чуць жывы ад страху Чарноў, зразумела, зараз-жа пасьпяшыў зьнікнуць у кулуарах Таўрычаскага палацу.

Прыбытак Часовага ўраду.

Прывітаўшыся з гарнізонам, які насыўна адносіўся да адбываўшыхся падзей, генэрал пашоў у гарнізонны камітэт.

Тут да яго зьявіліся прадстаўнікі ад рабочых Выбаргскага райёну Куклін і Рабіновіч і папрасілі галоўнакамандуючага аб'ясьніць падзеі, якія адбываліся. Генэрал Полаўцаў падрабязна растлумачыў, як быў выкананы загад аб ачышчэньні крэпасьці і палацу Кшэсінскай.

Пасьля, задаўшы рад пытаньняў аб тым, ці будзе другі гарнізон у крэпасьці, і чым аб'ясьніць рабочым учарайшыя падзеі ў рэдакцыі «Правды» і затрыманьне т. Каменева, Куклін і Рабіновіч паехалі з крэпасьці.

У гэты час да Полаўцава зьвярнуліся кранштадцы з просьбай зараз-жа выпусьціць іх з крэпасьці і не затрымліваць праверкай.

Генэрал адказаў, што адпускае іх на «честное слово».

Матросы нарыхтаваліся выйсьці цэлымі камандамі.

Але ў гэты час некаторыя з іх заявілі, што не паедуць зараз у Кранштадт, а пойдуць адведаць сваіх знаёмых і сваякоў у Петраградзе.

Гэтага ім не дазволілі: іх пагрузілі на судны і накіравалі ў Кранштадт.

Хроніка ліпнёвых падзей.

○ Раніцай па заводах і фабрыках Выбаргскай стараны была разаслана наступная адозва*):

„Заводзкім К-там.

Згодна распараджэньня Ц. К. Р. С.-Д. Р. П. (бальшавікоў), прапануем вам выбраць ад кожнае тысячы (500—1000) па аднаму дэлегату для складаньня агульнае дэлегацыі, якая будзе паслана ва У. Ц. В. К. Зьезду Саветаў з патрабаваньнем узяць уладу ў свае рукі. У 10 гадз. раніцы прыняць ўдзел у дэманстрацыі, якую наладжвае Ц. К. партыі (бальшавікоў). Зьбіраюцца каля клінікі Вільліе. Дэлегацыі ідуць са ўсімі дэманстрантамі і аддзяляюцца каля Таўрычаскага палацу.

Выбаргскі райёны К-т".

○ Апублікована наступная пастанова Час. Ур.: «З поваду выступленьня некаторых вайсковых часьцей, якое адбылося 3 ліпеня і ў ноч на 4 ліпеня, у выніку чаго аказаліся параненыя, маніфэстацыі забараняюцца».

○ Галоўнакамандуючы войскамі Петрогр. вокругу выдаў наступны загад:

«Выконваючы загад Ч. У. ачысьціць Петраград ад людзей, якія са зброяй у руках парушаюць парадак і пагражаюць асабовай і маемаснай небясьпецы грамадзян, прапаную жыхаром сталіцы ня выходзіць без крайняй неабходнасьці на вуліцы; замкнуць вароты дамоў і прыняць меры супроць магчымага прасякненьня ў дамы невядомых асоб.

Вайсковым часьцям прапаную прыступіць зараз-жа да аднаўленьня парадку на вуліцах.—Полаўцаў».

○ У 12 гадзін у Петраград прышлі войскі з Кранштадту. Аграмаднай доўгай стужкай яны прайшлі па горадзе ў поўным узброеньні. Атрады матросаў чарадаваліся з атрадамі салдат. За імі ішлі аграмадныя маніфэстацыі рабочых Петраградзкага і Васілеостраўскага райёнаў. Спераду і ззаду рабочых маніфэстантаў—узброеныя рабочыя дружыны. Па бакох знаходзіліся бранявыя аўтамабілі. Па ўсіх шматлікіх сьцягах толькі дзьве надпісі: «Прэч міністраў-капіталістаў!» і «Уся ўлада Савету Раб., Салд. і Сял. Дэпутатаў!»

○ Гэльсінгфорс. Цэнтр. К-т Балтыцкага флёту склікаў экстрэнае аб'яднанае пасяджэньне судовых камітэтаў. Старшыня ЦК Дыбенка агаласіў дзьве сакрэтныя юзаграмы пам. марскога міністра Дударова. У першай Дударой тэлеграфаваў камандуючаму флётам Вердэрэўскаму загад ч. у. выслаць у Петраград міноносцы: „Победитель", „Забияка", „Гром" і „Орфей", каб не дапусьціць у Петраград мяцежнікаў з боку Кранштадта (у тэлеграме ўказвалася, што ч. ур. дзейнічае ў кантакце з У.Ц.В.К.).

Другая тэлеграма ч. ур. за подпісам таго-ж капітана Дударова патрабавала ад камандуючага флётам, каб ён не дапусьціў выхаду суднаў з Гэльсінгфорса ў Кранштадт, ня спыняючыся нават перад патапленьнем некаторых карабляў надводнымі лодкамі.

Абгаварыўшы становішча, пасяджэньне прыняло наступную рэзалюцыю:

«Ц. К-т Балт. флёту, супольна з членамі суднавых камітэтаў, на пасяджэньні сваім 4-га ліпеня ў адказ на юзаграму пам. марскога міністра Дударова пастанавіў: тэрмінова паслаць эскадронны міноносец „Орфей" у горад Петраград, на якім камандыраваць на адным члену суднавых камітэтаў і членаў Ц. К-ту Бальт. флёту, як вывяцлядзіў хумкі ўсяго аб'яднага флёту, дзеля заведамленьня дакладных вестак бягучага моманту і для арыштаваньня пам. марскога міністра Дударова, які праявіў яўна контр-рэвалюцыйныя дзейсьні ў адносінах да працоўнай дэмакратыі».

○ З самай раніцы члены ч. ур. абмяньваліся па тэлефону, а пасьля асабіста думкамі, як рэагаваць на выступленьні ўзброеных рабочых, салдат і матросаў.

У згодзе з ВКСР і СД. рашано прыняць усе меры да навядзеньня парадку. Адпаведныя ўказаньні былі дадзены Полаўцаву.

Штаб ваеннага вокругу выпрацаваў падрабязны плян, як дзейнічаць, і к 7 гадз. вечара на Дварцовы пляц зьявіліся: Уладзімірская вайсковая школа, 9 конны полк, і першы казацкі полк.

Да 1 гадз. ночы былі прыняты меры да ліквідацыі ўзброенага выступленьня. Былі выключаны ўсе тэлефоны асоб і арганізацый, якія ўдзельнічалі ва ўзброеным выступленьні.

Ноччу затрымліваліся ўсе ўзброеныя маторы і асобы, якія знаходзіліся на іх, арыштоўваліся.

○ Міліюкоў у „Истории второй русской революции" піша аб становішчы ч. ур. у ліпнёвыя дні наступнае: „Быў момант, калі становішча ўраду здавалася безнадзейным. Прэабражэнцы, Сямёнаўцы, Ізмайлаўцы, якія не прысталі да бальшавікоў, заявілі ўраду, што яны захоўваюць «нейтралітэт». На Дварцовым пляцу, для абароны штабу, былі толькі інваліды і некалькі сотняў казакоў. Войскі з ваколіц Петраграду, выкліканыя галоўнакамандуючым вокругам ген. Полаўцавым, маглі зьявіцца толькі пад вечар, а пакуль што загад Полаўцава вайсковым часьцям „прыступіць безадкладна да аднаўленьня парадку" заставаўся мёртвым.

Урэшце, каля 7 гадз. вечара... прышлі на Дварцовы пляц і надмацавалі інвалідаў 9 конны полк, Уладзімірская вайсковая школа, першы казацкі полк.

*) Трэба думаць, што гэткія-ж адозвы былі разасланы і ў іншыя райёны Петраграду.

У САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ.

Сельска-гаспадарчы падатак.

Утоеныя аб'екты трэба выявіць!

(Узьдзенскі райён, Меншчына).

Праца па подрыхтоўцы да вучоту аб'ектаў ападаткаваньня ў сёлетнім годзе пачалася раней чымся ў мінулыя годы. 30 мая адбыўся пленум с.-с., на якім абгаварвалася пытаньне аб с.-с. падатку і вучоце аб'ектаў, дзе былі высьветлены ўсе зьмены і дапаўненьні поваага закону аб с.-г. падатку. Загадзя было растлумачана сялянству аб с.-г. падатку. Вучот пачалі і закончылі ў чэрвені м-цы.

У параўнаньні з мінулым годам, сялянства прымала больш актыўны ўдзел у гэтай працы. 60 проц. сялянства выказваліся супроць ападаткаваньня неземляробскіх прыбыткаў і пагэтаму вучотнай камісіі не ўдалося на 100 проц. іх падлічыць, але ў параўнаньні з мінулым годам неземляробскія прыбыткі павялічыліся з 5-ці да 9-ці тысяч руб.

Выяўлены ўтоеныя аб'екты: ральні 62,94 дзес. і сенажаці 19,84 дзес.

С.-савету патрэбна прыняць належныя меры дзеля выяўленьня сьвіньней і інш. жывёлы і утойшчыкаў прыцягнуць да адказнасьці.

Слабадзкі.

Нашы вынікі.

(В. Крушынаўскі с.-с. Рагачэўскі р.)

Вучот аб'ектаў ападаткаваньня па сельсавету распачаўся 1 чэрвеня і скончыўся 25.

На пашыраным пленуме склалі камісію вучоту, а па адным прадстаўніку ад вёсак абралі на вясковых сходах.

Трэба сказаць, што вучот прайшоў здавальняюча, праўда былі выпадкі (пос. Мордкава), калі хацелі ўтаіць жывёлу, але на ўтойшчыкаў склалі пратаколы і накіравалі у РВК.

У выніку ўважлівых адносін сялян да вучоту, і актыўнай працы вучотнай камісіі выяўлена некалькі дзесяцін ворнай зямлі, сенажаці. Праўда ёсьць памяншэньне жывёлы, асабліва сьвіньней. Так ворнай зямлі у мінулым годзе па ўсім с.-с. налічвалася—1845 дзес., а сёлета—1860 дзес., пасеву ў мінулым годзе—1477 дзес., цяпер—1421 дзес., Кароў паменшала на 138 штук.

Наогул, у галіне жывёлаводзтва прыкмячаецца некаторае паніжэньне, што тлумачыцца, хваробамі і нястачай корму. Скарг на неправільны вучот мала, ды і то толькі за неземляробскія прыбыткі, якіх налічваецца 5202 руб.

Я. М. Савіцкі.

Узаемадапамога.

Ня праца, а недарэчнасьць.

(Азэрскі сельсавет, Самахвалаўскага р-ну, Меншчына).

Умовы працы Азэрскага камітэту сялянскай узаемадапамогі надта добрыя, але ня гледзячы на гэта камітэт працуе дрэнна.

З налічаных 616 руб. сяброўскіх узносаў спагнана толькі 20 руб., што складае 3,5 проц. Тлумачыцца гэта тым, што як старшыня камітэту (якіх з моманту перавыбараў зьмянілася тры), так і члены з упаўнаважанымі амаль што ніякай працы не праводзяць.

Насельніцтва з працай камітэту зусім не знаёма, бо нікаму зрабіць справаздачу аб працы камітэту.

Фонд камітэту складаецца з 38 руб. і 104 пуд. збожжа, якое раздадзена насельніцтву і дакумэнтамі, як пазыка, не аформлена.

Маемасьці камітэт ніякай не мае, за выключэньнем аднаго сьвірна, над якім з боку камітэту няма гаспадарчага нагляду.

Узяты вясною ў крэдыт трыер да гэтага часу яшчэ не аплачан, хаця даўно прайшоў тэрмін аплаты, даўно прайшоў і ёсьць думка зьвярнуць яго крэдытнаму таварыству, бо выкупіць яго камітэт не мае сродкаў.

Пляну працы няма. Пленумы, а таксама і пасяджэньні камітэту не праводзяцца. Вучот сяброў таварыства, беднякоў, сірот, інвалідаў і інш. камітэтам не праведзен.

Сельсавет, які бачыць кепскую працу камітэту з

Рабочае жыцьцё.

ПАВЯЛІЧЫМ ВЫТВОРЧАСЬЦЬ.

(Паперовая фабрыка „Прафінтэрн" Н-Барысаў).

Пашырэньне вытворчасьці намечана ў наступным напрамку: 1) устанавіць бягуны для размолу архіўнага браку; 2) устанавіць 4 ролны дзеля размолу масы: 3) устанавіць каландр дзеля глазіроўкі паперы; 4) пабудаваць электрастанцыю сілай у 150 кілёват. Электрастанцыя папоўніць недахоп існуючай сілавой устаноўкі і будзе прыводзіць у рух усе новыя ўстаноўленыя машыны і станкі.

Апрача гэтага, намечана ўстанавіць 2 цыліндры дзеля сушкі паперы. Усё гэта абсталяваньне павялічыць вытворчасьць да 3600 тон у год бяз павялічэньня штату рабочых.

Праца па абсталяваньню часткай ужо выканана: устаноўлен каландр, пабудована каменнае памяшканьне дзеля электрастанцыі, перавезены з фабрыкі «Спартак» бягуны.

В. С.

ПАДЫШЛІ АКТЫЎНА І ЎВАЖЛІВА.

(Віцебск).

Павольна, па адзіночку і цэлымі групамі, зьбіраюцца працаўнікі прыватных прадпрыёмстваў саюзу камунальнай гаспадаркі на перавыбарчы сход групкома. Сход праходзіць на сьвежым паветры ў саду пажарнікаў. З пачатку сходу працаўнікі рассеяўшыся на прысадах абгаварываюць склад будучага групкому. Аркестр узьнімае настрой рабочых.

Наказ новаму групкому чытаецца на пунктах. Пасьля кожнага пункту абгаварваюцца дадаткі.

— Па летні пэрыяд неабходна ажывіць культурна-масавую працу.

— Неабходна павялічыць вылучэньне рабочых на гаспадарча-прафэсыянальную працу.

— Выраўніць фронт зьніжэньня цэн, там дзе не выканана 10 проц. зьніжэньня, прыняць меры да выкананьня дырэктывы.

— Весьці працу па ліквідацыі няпісьменнасьці.

— Прыняць меры да ўцягненьня ў ЦРК 100 проц. рабочых. Пасьля прыняцьця наказу прыступаюць да выбараў групкому. К кожнай кандыдатуры падыходзілі ўважліва ї дзеławіта.

Кожная кандыдатура абгаварвалася пэрсанальна.

Новы склад групкому абіраецца з 10 працаздольных таварышоў.

Л. Эйцінгін.

НАШЫ СПЭЦЫЯЛІСТЫ...

(Бобрскі млын, Аршаншчына).

На Бобрскім млыне налілі крупэрны камень. Здарэньне гэта як па ўсіх млынох звычайнае і гаварыць спэцыяльна аб гэтым ня трэ' было, каб прыкладам ня гэтакая зьява.

Прывязьлі на млын матар'ял к наліўцы камня, мэханік млына Лучко палічыў яго ня ўжытным і па яго загаду быў дастаўлен другі «годны» крамняк.

І 1-га ліпеня г. г. быў пушчан камень які выбухам ірабіў грунтоўную сьцяну млына. Работнік заўважыўшы незвычайнасьць камня, пашоў спыніць турбін і такім парадкам выратаваўся ад страшэннага выбуху які абышоўся без афяр.

Мэханік Лучко адзіны спэцыялісты—кіраўнік тэхнічнай старонкай справы, калі ведаў, што матарыял ня годны, так навошта пусьціў яго і падвяргаць небясьпекі рабочага. Матар'ял можна-б дасканала скарыстаць па наліўцы жоран апрача крупэрні.

Ці можа мэханік выконвае загады быўшага арандатара млына гр. Ратніцкага? Аршанская пракуратура павінна гэтым зацікавіцца.

Якуб.

АБ СПРАВАЗДАЧЫ ТАК І ЗАБЫЛІСЯ.

(Менск, 1-я друкарня).

Ужо з наўгода таму шэфбюро 1-й друкарні ўстрайвала лётарэю на карысьць падшэфнай вёскі.

Рабочыя прынялі самы актыўны ўдзел. Білеты распраданы былі ўсе, а сколькі атрымалі прыбытку—невядома.

Невядома таксама, нашто былі скарыстаны грошы, якая частка трапіла з іх у вёску і сколькі засталося яшчэ невыкарыстаным.

Шэфбюро справаздачы не рабіла—мусіць забыліся. Ня быў абвешчан і акт рэвізійнай камісіі, якая правяра ла прыбытак.

Рабочыя пытаюцца чаму ня едуць у вёску. Ці падтрымліваюць наогул якуюнебудзь сувязь з ёй.

Шэфбюро, а разам і рэвізійнай камісіі трэба паклапаціцца, каб абвясьціць вынікі лётарэі, вечара-спэктаклю і што зроблена ў вёсцы.

Удзельнік.

БУДУЕМ НОВЫЯ ШКЛЯНЫЯ ЗАВОДЫ.

500 рабочых знойдуць працу.

Пасёлак Ялізава, Бабруйск. акругі, ужо даўно вядомы, як месца, дзе разьвіта шкляная прамысловасьць. У 1912 годзе тут нейкі энэргічны арандатар пабудаваў невялікі шкляны заводзік. Выраблялися на гэтым заводзе выключна бутэлькі. Праіснаваў заводзік год з 10 і стаў. Прышла ў нягоднасьць веч, іншыя варштаты таксама адмовіліся працаваць. А месцы ў пасёлку—як раз для шкляных заводаў. Блізка рака, зараз пракладываюць чыгунку Асіпавічы-Гослаўль, якая захоплівае пасёлак. Раней ад пасёлку да станцыі было 12 вёрст, зараз ён будзе знаходзіцца толькі за наўвярсты ад яе.

Белшклотрэст рашыў выкарыстаць гэта надзвычайна ўдалае месца. І зараз у пасёлку Ялізава будуецца новы вялікі шкляны завод «Октябрь». Стары завод канчаткова разабраны. На яго месца будуецца новы корпус, у якім, між іншым, будзе сталоўка для рабочых, разьдзявальня, душы. Завод будзе пабудован з такім разьлікам, каб у наўмасьці адказваць запатрабаваньням аховы працы. На заводзе ўстанаўлецца новая ванная печ, прадукцыйнасьць якой будзе дасягаць 13.000 кг. у суткі. Новы завод будзе выпрацоўваць ужо ня бутэлькі, а шкло для вокан, лямпавае і інш.

Усяго на гэтым заводзе мяркуецца ўстанавіць 10 варштатаў, з якіх 5 будуць выпрацоўваць выключна лямпавае шкло. Пабудова заводу будзе каштаваць 120.000 руб. Палова гэтых грошай ужо адпушчана.

На заводзе будзе занята каля 500 рабочых. Спэцыяльна для іх у пасёлку будуецца 6 новых дамоў, якія хутка ўжо будуць гатовы. Будаўнічыя работы на заводзе ўжо распачаты. Зараз адбываецца пабудоўка галоўных корпусаў.

Пераходзім на торф.

Значна пашыраецца сёлета шкляны завод «Ільліч» (Быхаўскі р.). Завод таксама пастароў. У ім яшчэ дагэтуль працуе гаршковая печ. Раней была думка зусім зачыніць завод. Але зараз прызналі гэта нематэгодным.

Наваколь заводу ёсьць вялікія тарфяныя балоты. Летась на іх былі праведзены дасьледчыя працы, якія выявілі, што пры пераходзе заводу на тарфяны апал ён можа быць значна пашыраны.

Гэты пераход на торф ажыцьцяўляецца сёлета. Ужо працуюць дзьве тарфяныя машыны, якія загатовяць 1100—1200 куб. саж. торфу: гэтага хопіць на апал заводу ў працягу году.

На заводзе ўстанаўляецца новая печ. Спэцыяльна для гэтага зроблена ўмова са „Стеклостроем". Пры новай печы завод замест адной зьмены будзе ісьць 4 круглыя суткі працы.

На заводзе „Ільліч" выпрацоўваецца выключна аптычная пасуда.

Камбінат у Гомельшчыне.

Белшклотрэст праводзіць вялікую дасьледчую працу ў Гомельшчыне (у Нова-Беліцы), дзе ў хуткім часе мае быць пабудованы буйны шкло-камбінат. Дасьледы глебы і вады дай добрыя вынікі. Камбінат мае будавацца ля Кабыляньскіх тарфяных масываў.

Я.

„ТЫДЗЕНЬ АБАРОНЫ"---ДА ПОУНАЙ ПЕРАМОГІ НАД КАПІТАЛАМ.

Як прайшоў апошні дзень „Тыдню Абароны" ў БССР.

ВАЙНА БЕЗ ПРАЛІЦЬЦЯ КРЫВІ.

(Манэўры менскіх камсамольцаў).

16-га ліпеня ўвечары ля Менскага акружкому камсамолу можна было наглядаць надзвычайна цікавы малюнак.

Доўгай стужкай расьцягнуліся па вуліцы шэрагі новай, дагэтуль невядомай арміі.

Армія, праўда, была не ў аднэй форме. Яе салдаты не насілі ніякіх адзнакаў. Але за тое ўсе яны стройна сталі і моцна трымалі вінтоўкі ў руках. Армія была ўзброена вінтоўкамі, дысцыплінай і... песьнямі.

Песень было многа. Самых вясёлых, камсамольскіх песень.

Калі рабочыя ў часе «Тыдню абароны» уступаюць у ОСО-Авіахім, ахвяроўваюць сродкі на пабудову новых самалётаў, камсамольцы павінны хоць на дзень, хоць на гадзіну стаць сапраўднымі чырвонаармейцамі. І вось узьнікла думка аб манэўрах. З вялікім посьпехам такія манэўры правяла Бабруйская камсамолія. Тры дні былі ў паходзе, тры дні жылі чырвонаармейскім жыцьцём.

Манэўры менскіх камсамольцаў арганізаваў Менскі Акружком ЛКСМБ супольна з рэдакцыяй газ. «Чырвоная Зьмена».

Да манэўраў доўга рыхтаваліся. Абгаварвалі гэта пытаньне на пасяджэньні «штабу», вывучалі розныя дробязі. І, урэшце сакрэтныя паперкі актывістам-камсамольцам.

— Сёньня абавязкова прыходзь у сад імя КІМ'а. Усе асабістыя справы ў бок.

Вайсковая дысцыпліна...

На вуліцы імя Энгельса бурліць мора. 700 маладых камсамольцаў-чырвонаармейцаў рыхтуюцца ў паход.

Здаецца, што на горад наступае нейкі вораг. Усе з вінтоўкамі.

Ходзяць і аглядаюць сваё войска маўклівыя камандзіры.

І вось загад—выступаць!

Будзяць сонны горад ліхія камсамольскі песьні.

«Армія» выступае ў паход.

Вышлі далёка, вёрст за 15 ад Менску.

І тут камсамольцы яскрава выявілі сваю баявую здольнасьць, сваю вайсковую падрыхтаванасьць.

Іх чакаў «вораг». «Вораг»—чырвонаармейцы з лягэраў.

Вораг моцны—падрыхтаваны.

Гэта было ў ноч на 17 ліпеня.

Цёмны лес. Цішыня. Ведаюць, што «вораг» блізка. І таму ні аднаго лішняга слова.

Войны бываюць усякія... Ідуць камсамольцы ціхім лесам. Прарэзваюць яго. Будзяць глухую цішыню.

Ідуць... Рамень ад вінтоўкі ража плячо.

Ах, вінтоўка! Мала аб табе песень складалі. Дарагая ты для нас.

Лес цягнецца. Няма канца лесу. Цішыня... Камандзіры ціха радзяцца, як павесьці наступ. Бегла правяраюць ранейшыя пляны. Аддаюць загады.

Здавалася, што вайна сапраўды настала. Што сапраўды ворагі блізка. Вораг наступае. Сталіца ў небясьпецы... І гэта надае бадзёрасьці. Мацней трымаеш вінтоўку. Глядзіш у даль... І здаецца, што-вось вось адбудзецца бойка.

«Бойка» адбылася. Ажыў лес. Цішыні, як ня бывала. Змагаліся па ўсіх правілах ваеннага мастацтва. Бралі ў палон, хітра наступалі.

Камсамольцы ля кулямёту.

Цяжка перадаць уражаньне ад гэтай «бойкі бяз крыві». Але прайшла яна з надзвычайным уздымам. І тое, што прытрымліваліся дысцыпліны, што наступалі па пляну, 15 вёрст адмахалі пехатой—сьведчыць аб тым, што камсамолія адзін з самых баявых нашых атрадаў, што вайсковая яе падрыхтоўка на вышыні.

Былі ў гэтым натоўпе і промахі, бо якая армія ня мае іх. Промахі разабралі на спэцыяльным савеце. І, вразумела, больш іх ня будзе.

У паходзе прабылі цэлую ноч. Цэлую ноч жылі сапраўдным чырвонаармейскім жыцьцём.

Доўга гэтую ноч будуць успамінаць менскія камсамольцы, як зараз успамінаюць баявыя дні грамадзянскай вайны...

Цішыня, начны паход, песьні і вінтоўка за плячыма заўсёды будзе нагадваць менскай камсамоліі аб пагрозах сапраўднай вайны.

Раніцай 17-га, вярнуліся ў горад. І нейк дзіўна было, што на вуліцах такі рух. Спакойна ходзяць людзі, пасьвяточнаму убраныя. Ніякай трывогі, ніякага ворага.

Спакойна!

Гэты спакой змогуць адстаяць камсамольцы.

Я. С-і.

ОСО-Авіахім--дапамога сельскай гаспадарцы.

(Ячэйка-АСО-Авіахіму пры Бел. Дз. с.-г. Акадэміі).

З дасягненьняў нашай ячэйкі, якія яна мае да «Тыдню Абароны», можна адзначыць наступныя.

Вясеньняя кампанія па пратручваньні насеньня ад галаўні, праведзеная ў Горацкім раёне, ахапіла 15 вёсак ці 129 асобных гаспадарак, пры гэтым пратручана—620 пудоў насеньня—пшаніцы і ячменю. Акрамя таго, каб паказаць насельніцтву карысьць пратручаньня і павялічэньня ад гэтага ўраджаю, закладзены 2 дасьледча-паказальныя вучасткі з пратручаным і непратручаным насеньнем. Праца праводзілася на вёсках пад непасрэдным кіраўніцтвам студэнтаў-агранамаў.

Для папулярызацыі мінэральных угнаеньняў у раёне закладзены 4 дасьледча-паказальныя палі, апроч таго, хутка пачнуцца закладзіны яшчэ 10 палёў па азіміне. Зараз, у „Тыдзень Абароны», на дасьледча-паказальных палёх праводзяцца экскурсіі з сябрамі ОСО-Авіахіму і мясцовым насельніцтвам і адбываюцца агранамічныя гутаркі.

Вядзецца з посьпехам барацьба з гародняю блыхой, якая пачала зьнішчаць капусту і інш. расьліны. Працай гэтай кіруе с.-г. сэкцыя ячэйкі ў кантакце з раённым зямел. аддзелам.

У выніку гэтых мерапрыёмстваў на вёсцы заўважваецца моцны рух сялянства ў ОСО-Авіахім.

Я. Р.

Газы нас не палохаюць.

17 ліпеня Менскі ОСО-Авіахім наладзіў масавае газавае «хрышчэньне» для сябраў т-ва. „Хрышчэньне" адбывалася за горадам у спэцыяльных газа-прытулках. „Панюхаць" газ сабралася многа менскіх рабочых, студэнтаў, камсамольцаў...

Спачатку неяк страшна з наврывічні. Рабочыя, якіе ужо прыходзілася ўмець справу з газам у часе імпэрыялістычнай вайны, перадаюць свае ўражаньні таварышам.

Газа-прытудан—невялічкае памяшканьне. Зачыненае. Газ сюды прасякае па асобых трубках.

У памяшканьне ўваходзяць групы па 15-20 чалавек. Усе ў процівагазах. «Хрышчэньне» цягнецца некальки хвілін.

ОСО-Авіахімцы выходзяць з памяшканьня, ажыўлена перадаюць свае ўражаньне.

— Ня страшны газ, калі ёсьць процівагаз.

Зьмітраўцы даюць прыклад.

(Зьмітраўскі сельсавет, Бярэзінскага раёну, Барысаўшчына).

Азнаёміўшыся з друку, што з 10 да 17 ліпеня будзе праводзіцца кампанія абароны дзяржавы, зьмітраўская ячэйка адразу павяла падрыхтоўчую працу сярод сялянства. Яшчэ да тыднявіку абароны было растлумачана сялянству міжнароднае становішча і нашы ўзаемаадносіны з капіталістычнымі дзяржавамі.

Як пачаўся тыднёвік, ячэйка прыступіла да збору сродкаў па падпісных лістох на пабудову эскадрыльі «Наш адказ Чэмбэрлену». Сялянства, перажыўшы польскую акупацыю і добра ведаючы цану вайны, хутка адгукнулася на покліч ячэйкі і пачала ахвяроўваць сродкі, хто колькі мог. Ужо па Зьмітраўскім сельсавеце сабрана 30 руб. грашмі, і збор адбываецца далей.

Наогул, «Тыдзень Абароны» праходзіць з посьпехам ня толькі па Зьмітраўскім сельсавеце, але і па ўсім Бярэзінскім раёне, што сьведчыць аб належнай падрыхтоўцы з боку партыйных і савецкіх арганізацый.

Селькор Ч.

„Тыдзень Абароны" ў Слуцку.

Для правядзеньня «Тыдню Абароны» у горадзе і на раёне была выдзелена асобая камісія з прадстаўнікоў партыйных, прафэсыянальных і вайсковых арганізацый. Камісія распрацоўвала плян, прычым асаблівая ўвага была зьвернута на вёску.

Вызначана шмат таварышоў, якія павінны выехаць на вёску, зрабіць там даклады і правесьці сходы.

У горадзе ва ўсіх саюзах былі праведзены сходы, прысьвечаныя «Тыдню Абароны». Сходы праходзілі актыўна; выносіліся пастановы аб адлічэньнях у фонд «Наш адказ Чэмбэрлену». За гэты час праведзены два скарбоначныя зборы: адзін камсамолам, другі камісіяй. Сабрана 75 руб. Ячэйка ОСО-Авіахіму пры арцелі «Возрождение» правяла лётарэю, якая дала 50 руб. 10 ліпеня ў летнім рабочым садзе было арганізавана вялікае гуляньне з фізкультурнымі спаборніцтвамі і стралковым цірам. Апрача гэтага, камісія намеціла 17 ліпеня правесьці скарбоначны збор і лётарэю. Раённа-гарадзкі камітэт, супольна з палком, падрыхтоўвае на 16 ліпеня інсцэніроўку, у якой, апрача гарадзкіх ячэек ОСО-Авіахіму, прыме ўдзел Урэцкая ячэйка. Наогул, у горадзе кампанія праходзе са значным уздымам.

Для папулярызацыі вайсковай літаратуры мясцовая кнігарня БДВ наладзіла цэлы шэраг выставак гэтай літаратуры ў клюбе імя Крэйнэса, на настаўніцкіх курсах і ў вайсковых часьцях.

З раёну дакладных вестак няма. У гутарках з асобнымі таварышамі высьветлілася, што там кампанія праходзіць ня зусім добра. Сходы наведваюцца сялянамі слаба, дзякуючы таму, што цяпер усе прынялися за касавіцу.

Таксама заўважваецца слабая ініцыятыва з боку мясцовых нізавых ячэек. Гэта паказвае, што некаторыя ячэйкі добра ня ўцямілі вялікага значэньня «Тыдню Абароны» і не зьвярнулі належнай ўвагі на правядзеньне яго.

П. К.

„Тыдзень Абароны" ў Бабруйшчыне.

Калі Сідар Іванавіч Панчошкін—звычайны абываталь Бабруйску, пасунуўся ў нядзелю 10 ліпеня на рынак купіць сяго-таго на абед, то яго рэжовыя мары аб дзесятку яек, сьвежай цыбулі і літры сьмятаны—зніклі раптам, разьвеяліся пылам на Бабруйскай вуліцы.

Сідар Іванавіч нават выказаў намер ушчыпнуць сябе за левую ляжку, каб дасканала ўпэўніцца—ці то сьпіць ён, ці запраўдная рэчавістасьць стаіць перад яго лупаючымі вачмі.

І ўшчыпнуў-бы Сідар Іванавіч сваё пешчанае, белае цела, пастрадала-б ляжка, але... надышоў жандар, страшэнны польскі жандар з бізуном і чорнымі бізунамі-вусамі і рыкнуў—прагрымеў над панчошкінскімі вушамі:

— Ага, папаўся бальшавік! Хадземка, дапросім, запытаем малойчыка...

А на бальконе сядзелі генэралы, афіцэры, багатыя паненкі і паны, нехта крычаў з бальконy:

— Зьнішчым бальшавікоў, няхай жыве яснавельможнае панства...

І жоўнежы на вуліцы крычалі «віват», і шалёна грымела музыка:

— Яшчэ Польска не згінэла!..

Сідар Іванавіч згорбіўшыся ішоў за жандарам і прыпамінаў усе свае важныя і няважныя бальшавіцкія «грахі». Грахоў, здаецца, за ім ня было, за выключэньнем хіба аднаго, калі ён міргнуў раз суседцы, за што і прыняў пакорна належную кару ад жонкі.

— За што-ж, за што мяне вядуць.

І ўжо Сідар Іванавіч думаў пусьціць самую запраўдную сьлязу, як раптам пачаліся стрэлы, праімчаўся бранявік над самай вуліцай, узьляталіся самалёты, жандар пусьціўся наўцёкі, замітусіліся паны, польскія жоўнежы віхрам праімчаліся ў перавулак і, к надзвычайнай радасьці Панчошкіна, вуліца зноў прыняла свой звычайны выгляд, калі можна зноў спакойна думаць аб сьмятане, аб цёмчы і заветнай сотны, захаванай падальш ад спрытных цёмчыных воч.

К Панчошкіну зьвярнулася памяць—успомніў ён, што ўсё гэта ня сон, і не рэчавістасьць, а самая звычайная інсцэніроўка заняцьця гораду белапалякамі.

Але ўсё-ж Сідар Іванавіч на рынак не пашоў. Яго душа, хоць і вынырнула з панчохі, але была так усхвалявана, узварушана, што парашыла хутчэй зьвярнуцца да хаты, дзе ўсё-ж куды забясьпечней.

Абывацельскія думы былі ўскалыхнуты.

Але даволі аб абываталях. Паглядзім, што прароблена працоўнымі акругі за гэты тыдзень абароны. Пачаўся ён інсцэніроўкай заняцьця гораду белапалякамі, наладжанай ОСО-Авіахімам. 9-га і 10-га ліпеня быў праведзены скарбоначны збор грошай на «Наш адказ Чэмбэрлену. Збор даў 273 рублі. Гэты збор быў наладжан яшчэ 16 і 15 ліпеня. У гэты-ж час была наладжана выгрышная лётарэя, якая дала, прыблізна, каля 1200 рублёў. Білеты на лётарэю распаўсюджваліся пасьпяхова.

Да «Тыдню Абароны» актыўна рыхтаваліся ўсе ячэйкі ОСО-авіахіму. Праводзілася праца сярод сяброў арганізацыі па ўсіх галінах ОСО-авіахімскай работы, па ўцягваньню новых сяброў, па збору сродкаў на «Наш адказ Чэмбэрлену», праз вызавы ў друку сабрана даволі значная сума грошай.

Значную працу па ваенізацыі насельніцтва і асабліва моладзі правёў камсамол. Амаль у кожнай ячэйцы арганізаваны вайсковыя гурткі пасьпяхова працуючыя. Ёсьць санітарныя гурткі, закончылі працу курсы санітараў на 50 чалавек. Як на вялікае дасягненьне па ваенізацыі моладзі прыходзіцца ўказаць на праведзеныя камсамолам манэўры, у якіх прынялі ўдзел каля 2000 камсамольцаў гарадзкой і райённай арганізацыі, элемэнтарныя тактычныя веды, арыентыроўка ў баявой абстаноўцы—усё гэта далі манэўры кожнаму камсамольцу.

Разварушылі сваю працу гарадзкія і вясковыя ячэйкі ОСО-Авіахіму. 15, 16 і 17 ліпеня адбыліся стралковыя спаборніцтвы на лепшага стралка і спаборніцтвы на лепшы гурток вайсковых ведаў. Цэлы тыдзень адчынена чырвонаармейская выстаўка, дзе кожны зможа азнаёміцца з любай рэччу вайсковага рыхтунку і ўзброеньня, пачынаючы ад хімічных формул і канчаючы цяжкімі гарматамі і бранявікамі.

Тыдзень абароны закончыўся ў Бабруйску грандыёзнай інсцэніроўкай паветрана-хімічнай абароны гораду. Гэта інсцэніроўка мела на ўвазе азнаёміць шырокія масы працоўных з практычнымі мерапрыёмствамі па аказаньню абароны і дапамогі ў умовах нападу, паказаць сумесную і ўзгоджаную работу авіахімкаманд, міліцыі, пажарнай каманды, мерапрыёмствы мэдыцынскай дапамогі і г. д.

Так прайшоў у нас «Тыдзень Абароны».

Л.

Фізкультурнікі ваенізуюцца.

(Магілёў).

Фізкультурнікі Магілёўшчыны добра зразумелі значэньне ваенізацыі. Акрамя буднічнай працы па ваенізацыі ў сваіх гурткох, фізкультурнікі прымаюць самы актыўны ўдзел у правядзеньні «Тыдню абароны».

Акруговы савет фізкультуры праводзіць супольна з саветам ОСО-Авіахіму конкурс на лепшага стралка з рабочасялянскай і вучнёўскай моладзі.

У падрыхтоўцы (папярэдняй стральбе) да канкурсу ўдзельнічала 150 чалавек. З іх да конкурсу было дапушчана 50 чалавек. Конкурс адбыўся ў суботу 16-га ліпеня ў стралковым цірэ савету фізкультуры ў прысутнасьці шматлікай публікі.

У суботу ўвечары адбылася грандыёзнае спаборніцтва на гроблі.

14 ліпеня праведзена спаборніцтва па плаваньні для пераменьнікаў. Удзельнічала 150 чалавек. У нядзелю 17 ліпеня, адбыўся футбольны матч. Магілёў—Ворша.

Ва ўсіх ячэйках фізкультуры праведзены даклады аб значэньні ОСО-Авіахіму ў справе абароны краіны. Праведзена агітацыя за уступленьне ў шэрагі т-ва. Пакуль-што ў ОСО-Авіахім уцягнута 150 чалавек фізкультурнікаў. Распачата пабудоўка воднай станцыі на сродкі савету фізкультуры. Закуплена 10 тысяч баявых патронаў і 45 баявых вінтовак для навучаньня фізкультурнікаў стральбе.

Некаторыя ячэйкі закупілі гранаты і вучацца кідаць іх. Каманды грабцоў супольна з прадстаўнікамі ОСО-Авіахіму выяжджалі (з Магілёва) на лодках на Дняпру ў Воршу, Шклоў, Быхаў і Дашкаўку. Вясковыя ячэйкі прымаюць актыўны ўдзел у працы па ваенізацыі, асабліва у Быхаўскім раёне.

М. Л.

На аэрадроме.

(Магілеўшчына).

Працоўныя Магілеўшчыны парашютны першы дзень «Тыдню абароны» правесьці ў гасьцёх у лягэрах Чырвонай арміі.

Сабраліся каля сваіх прадпрыемстваў і пад гукі аркестра весела пашлі ў госьці.

Падыходзіўшы к лягэрам нас сустрэла ўрачыстае спатканьне. Выстраіўшыся па лінейцы ўдоўж белых палатак чырвонаармейцы прапусьцілі да сябе ў лягэр гасьцей. А потым, калі скамандавалі камандзіры «разыходзься!» перамяшаліся чырвонаармейскія гімнасьцёркі ў натоўпе рабочых і служачых.

Яшчэ не пачынаўся мітынг, як пачалося шырокае братаньне «гасьцей» і «гаспадароў» на полі каля лягэраў.

З прамовамі выступілі — сэкратар акруг. камітэту Грысэвіч, старш. акр. выканкому Дубіна, ад кав. корпусу т. Цімашэнка, тэрытарыяльнай дывізіі т. Гарасімаў і шэраг іншых таварышоў.

Усе яны кажуць аб растучай ваеннай небясьпецы, аб тым, якое вялізнае значэньне павінен адыграць «Тыдзень абароны» ў справе ўзмацненьня сіл Савецкага Саюзу.

Пасьля мітынгу пачалася інсцэніроўка бойкі.

Лапцугом расьцягнуўшыся ўдоўж поля паказалі чырвоныя саперы, што добра навучыліся яны сваей спэцыяльнасьці.

Ужо вечарэла, але праграма сьвяткаваньня яшчэ далёка ня была скончана.

Кавалерыстаў, надта ўдала браўшых разнастайныя барьеры і перашкоды, зьмянілі фізкультурнікі.

А на аэрадроме адна за адной узьдымаліся сталёвыя птушкі з новымі пасажырамі ў кабінках.

Маладыя чырвонаармейцы-перамеьнікі, якім пашчасьціла палянцець, весела ўсьміхаліся, разьвіваючыся з зямлёй.

«Малы А-сь».

Экскурсіі...

(На агульна-гарадзкой вайсковай выстаўцы).

Адна за аднэй цягнуліся на агульна-гарадзкую вайсковую выстаўку экскурсіі. Прыходзілі рабочыя дэлегаткі, моладзь. Хваля экскурсій плыла з самай раніцы, да позняга вечара, пакуль зачыняўся сад, і гасьлі агні.

У летнім садзе «Прафінтэрн», у самым сьвежым і «дачным» зараз месцы адчынілі выстаўку. Шырокі павільён. Здалек вабіць плякат: «Вайсковая выстаўка».

Дажурны ў кароткіх рысах знаёмыць з выстаўкай.

— Наша выстаўка мела на мэце паказаць, якім павінен быць вайсковы куток пры прадпрыёмствах. Гэтых вайсковых куткоў па БССР зараз ёсьць вельмі многа, але яны ня зусім добра абсталяваны. Нядаўна быў праведзен агляд найбольш буйных вайсковых гурткоў. І часта мы бачылі гэткую карціну: Вайсковы куток—гэта тры, чатыры плякаты, некалькі лёзунгаў, начарпеўшых ад старасьці—вось і ўся ваенізацыя.

Зусім іншы выгляд мае вайсковы куток на гэтай выстаўцы.

Тыя-ж плякаты. Але яны лепш падабраны. Вось плякат, які можа навучыць, як трэба страляць. Аб карысьці гэткіх падручнікаў можна не гаварыць. Мы далёка ня ўсе ведаем, як трэба трымаць вінтоўку ў руках.

На выстаўцы шмат літаратуры. Ля кніжных вітрын—натоўп.

Камсамолец з віхрастымі валасамі тлумачыць сваім сябрам, як вучыцца вайсковай справе.

Спачатку я прачытаў вось гэтую кніжачку. Вялікае ўражаньне зрабіла. Пасьля за больш сур'ёзныя ўзяўся. Спадабалася. Зараз перайшоў да авіацыі. Ахвота ведаць, як гэта лятуны ў паветры трымаюцца.

Камсамолца ўважліва слухаюць.

— Сапраўдны „прафэсар" вайсковых ведаў,—жартуюць сябры.

Экскурсіям намагаюць разьбірацца ў экспанатах спэцыяльныя групаводы.

Вось экскурсія падышла да газавага аддзелу. Дзяўчаты цікавіцца пропівагазамі. Надзяваюць іх на сябе, лічаць, колькі хвілін кожная можа прабыць у ім.

Зусім іншае цікавіць хлапцоў. На выстаўцы адчынен невялічкі пір. Каля вінтоўкі—цэлае спаборніцтва.

Хто нападзе? Выстрал каштуе пяць капеек. Стралянць па пяць, па дзесяць раз. Кожнае нападаньне спатыкаюць воплескамі.

З раніцы ажывае выстаўка. Хвалямі ныне вуць экскурсіі. Моладзь, старыя вартуюць каля вінтоўкі, зьбіраецца натоўп ля кніжных вітрын.

Я. С—і.

Рабочыя Меншвэю падцягваюцца.

Агульны сход рабочых Меншвэю сабраў да 400 чал.

Тэма дню (даклад аб значэньні «Тыдню Абароны») знайшла ў масе рабочых Меншвэю самы жывы водгук.

Без усялякіх дэбатаў сход пастанавіў адлічыць ка карысьць «Тыдню» чвэрць аднаднёвага заробку.

Адначасна «Тыдзень» пад'агуліў працу гуртка вайсковых ведаў (70 чал.), які існуе пры Меншвэі 6 месяцаў.

Зараз набываюцца вінтоўкі для практычных заняткаў. На днях будзе заснаваны цір у садзе Меншвэю па вул. Энгельса.

Экскурсія ўсяе ячэйкі КСМ (40 чал.) у лягер «Чырвонае Ўрочышча» адбудзецца 17-га ліпеня.

«Тыдзень Абароны» аварушыў Меншвэй у бок ваенізацыі.

М. В—аў.

Ваенізацыя ў Управе Дзяржаўнага Гандлю.

7-ы дзень працуе вайсковы куток адчынены ячэйкаю ОСО-Авіахіму.

Куток вельмі ахвотна наведваецца рознаю публікаю—ня толькі працаўнікамі дзяржгандлю, глядача прыцягваюць вайсковыя рэчы, якіх шмат у кутку.

Разьвівае працу і вайсковы гурток, які налічвае 40 чалавек.

Заняткі ў гуртку ахопліваюць усе бакі вайсковых ведаў: баявую тактыку, вайскова-хімічную справу, стралковую галіну і інш.

Заняткамі кіруюць вайсковыя спэцы і больш кваліфікаваныя таварышы з вайсковага гуртка сапрыхільнай вайсковай часткі.

Я—і.

Іл. Барашка.

БРАТ, РОДНЫ МОЙ БРАТ!

(Эскіз).

Брат, ты родны мне!

Твае сьлёзы былі маймі сьлязьмі, твая радасьць была маёй радасьцю...

Брат! Ты памятуеш наша страшэннае горе? Ты не забыўся аб ім, ты памятуеш яго, як і памятую я... Страта роднага бацькі... Страшная страта... Абставіны сьмерці? Ня пытай, не ўспамінай... Былі сьлёзы, была страта... Цяжкая страта, неўзваротная...

Брат! Ты памятаеш плач нашай мамы? Ці чуеш яго ты цяпер? Плакала мама... Сьлёзы ізьлілі з яе вачэй на вашы галовы... Памятуеш... плакалі і мы... Бо плакаць троба было... Быў страчаны бацька... адзін... Ты памятуеш, як спытаўся ты ў мяне:

— І тата памёр? Яго няма?

Я табе адказаў:

— Не памёр, а забілі...

Ты, вядома, памятуеш, хто забіў тату, бо чуеш плач мамы... Мама і цяпер плача, успамінаючы пра... Пра што ўспамінае яна?

Вясна... Цьвілі сады. Бэсаны чад разносіўся ў паветры, улізаўся глыбока ў грудзі... Ты памятуеш акопы... Чорныя стужкі вырытай зямлі... Вужакаю віліся яны наўкола нашага гораду... А тата наш быў малады. Памятуеш—чарнявыя вусы, шырокі лоб, вочы—добрыя, вясёлыя... Брат! я ня памятую, якога колеру былі вочы нашага бацькі... Мама казала, што вочы бацькавы былі такія, як і ў мяне... Мае блакітныя... Ці ня памятуеш, якога колеру былі вочы нашага таты?..

... А тата прышоў у хату з вінтоўкай... Вінтоўка ў яго вісела цераз плячо... Поясам у яго была лента з патронамі... Жоўтенькія такія, бы цапачкі-сьвісьцёлкі... І беленькія вострыя галоўкі... Беленькія... Срэбныя... Тата прышоў быў у хату. Памятуеш, як ён цалаваў мяне, пябе, як абдымаў маму... Памятуеш, як ён супакойваў маму, а яна плакала, і сьлёзы цяклі на бацькавы грудзі...

Тата казаў:

... Вярнуся... трэба... не адзін я, а усе... А за гораздам віліся чорнай стужкай акопы... І тата пашоў... Тата пашоў ратаваць... Мы чулі страляніну, чулі выбухі гарматаў, хоць і сядзелі ў склепе... Мама тады дрыжэла пу вядома—не ад холаду, а ад страху...

А тата пашоў. Памятуеш, мама перажагнала яго... А ён сказаў:—Ня троба... суджана—вярнуся, а ня суджана... І тата пашоў... А мы з табою былі малыя, і ня ведалі... Мама нам не казала... чаго пашоў тата ў акопы... А яна ведала, што тата разам з другімі, пашоў ваяваць... З кім? Мы ня ведалі, з кім... Толькі, як таты ня стала, мама праклінала пара... Яна і цяпер, калі твар яе ўжо пакрыўся маршчынамі, калі старасьць пакладе на яе сваю цяжкую пячаць, кажа часамі:

— Пан з панам біўся, а ў мужыка лоб трашчэў...

І тата загінуў... Мама плакала... памятуеш, як плакала мама, калі таты таварыш паведаміў пра сьмерць... Памятуеш як плакалі мы... Ты памятуеш, як на другі дзень пасьля сьмерці нашага таты мама павяла нас у поле, і мы шукалі... тату... І таты не знайшлі, бо было ў полі цёмна... Усё поле было ўкладзена соткамі чалавечых цел...

Мама казала: гэта таксама нейчыя таты... і плакала, прыглядаючыся ў твар кожнаму мерцьвяку, што воблагам ляжалі скрозь поля. І таты мы не знайшлі... Памятуеш, як цьмяна гарэла газьвічка ў той вечар... Здавалася—і яна разам з намі плакала, нам спачувала... І было так шэра, так нудна скровь... Ты памятуеш, мы лягалі спаць, а як усталі, то адзін другому апавядалі страшны сон... Табе прысьнілася тое, што і мне: мёртвыя людзі...

Брат! і з таго моманту ў мяне з табою ня стала таты. Добрага таты, любага... Мама кажа, што яго забіў цар...

Брат, родны брат! Твае сьлёзы былі маймі-сьлязьмі...

* * *

Брат! Ты пам

Навальніца ў Менску.

Учора каля 4-й гадзіны дню ў Менску выпаў набывалы дождж. Дождж падаў як доўга, але быў настолькі густы, што за некалькі хвілін нарабіў шмат шкоды. На Ленінскай вуліцы, якая знаходзіцца параўнальна на высокім месцы, вада затапіла падвальныя памяшканьні, у тым ліку і хлебапякарню працкалектыву. На Інтэрнацыянальнай вул. у д. № 7, вада заліла пральню.

У райёне р. Німігі залітэ шмат жылых і гандлёвых памяшканьняў. Жыльцы змушаны былі пакінуць свае кватэры.

Паток вады, які шоў за ўсю шырыню вуліц, зьнёс амаль усе драўляныя мосьцікі ў горадзе.

Пажарныя машыны былі разаслань ў розныя часткі гораду і выпампоўвалі ваду з памяшканьняў.

У Прэзыдыуме ЦВК БССР.

Пасяджэньні Прэзыдыуму ЦВК БССР 4 і 14 ліпеня адбыліся пад старшынством тав. Хацкевіча Разгледжаны наступныя пытаньні:

МАТАР'ЯЛЫ ДА 10-ГОДЗЬДЗЯ КАСТРЫЧНІКАВАЙ РЭВАЛЮЦЫІ.

Прэзыдыум ЦВК прапанаваў усім цэнтральным і мясцовым установам і арганізацыям накіроўваць у цэнтральную камісію па арганізацыі і правядзеньню сьвяткаваньня 10-годзьдзя Кастрычнікавай Рэвалюцыі, пры Прэзыдыуме ЦВК Саюзу ўсю юбілейную літаратуру, якую выдаюць і якая ўжо выдана. Таксама ў Цэнтральную Камісію трэба прысылаць тыя газэты, у якіх маецца апісаньне падрыхтоўкі да юбілею ці апісаньне ўжо праведзеных папярэдніх момантаў сьвята.

ВЫРАШЭНЬНЕ ПЫТАНЬНЯ АБ СПРЭЧНАЙ ЗЯМЛІ.

Прэзыдыум ЦВК абмеркаваў вынікі абсьледаваньня на месцы справы аб спрэчнай зямлі паміж гр. гр. в. Замасточча (Менскае акругі) і сав. гаспадаркаю Косіна.

Наркамзему, якому накіраваны вынікі абсьледаваньня, даручана вырашыць гэтае пытаньне ў двухтыднёвы тэрмін. Акрамя гэтага. НКЗ даручана арганізаваць асушку балота, якое знаходзіцца ў райёне спрэчнай зямлі, з водпускам адпаведных сродкаў з мэліярацыйнага фонду. Да канчатковай асушкі балота павінны быць замацаваны за сялянамі тыя пасьцьбішчы, якімі яны карысталіся да гэтага часу. Пасьля асушкі балота, пры земляўпарадкаваньні, трэба забясьпечыць сялян в. Замасточча і савгаспадарку патрэбнай колькасьцю зямлі.

ЛЬГОТЫ СЕМ'ЯМ ВАЙСКОВА-СЛУЖАЧЫХ.

Прэзыдыум ЦВК заслухаў даклад Менскага акруговага выканаўчага камітэту аб ільготах вайскова-служачым, служачым флёту і іх сем'ям. Садаклад зрабіў прадстаўнік НК РСІ.

Абрана камісія над старшынством т. Сэгаля, якой даручана апрацаваць рэзалюцыю па гэтаму пытаньню. Рэзалюцыя будзе заслухана на чарговым пасяджэньні прэзыдыуму.

ПРАЦА АСОБАЙ КАЛЕГІІ ПА ЗЯМЕЛЬНЫХ СПРАВАХ.

На пасяджэньні Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР 14-га ліпеня Старшыня Асобае Калегіі Вышэйшага Кантролю па зямельных справах тав. Лабаноўскі зрабіў даклад аб працы зямельнага суду БССР.

Як відаць з дакладу, за мінулы год Зямельныя Камісіі і Асобая Калегія павінны былі разглядзець 39.178 зямельных спраў, а вырашылі яны 32.577 спраў. З ліку разгледжаных спраў аскарджана толькі 7.764 гэта значыць—24 проц У папярэднія гады процант аскарджаньня быў 32.

Пры разглядзе вышэйшымі інстанцыямі скарг на пастановы зямельных камісій адхілены скаргі па 4731 справе (60 проц.), а раней 1926 г. рашэньні зямельных камісій зацьвярджаліся толькі па 47 проц. аскарджаных спраў. Такім чынам з агульнага ліку 32.577 спраў, разгледжаных Зямельным Судом БССР, адменена толькі 3033 рашэньняў ці 9 проц.

Сярэдняя расцягласьць руху спраў праз усе інстанцыі Зямельнага Суду складае цяпер 6 месяцаў, а да рэарганізацыі Зямельнай Камісіі ў 1925 г. была 1—палова г.

Разам з тым, штодзённая праца Зямельных камісій выявіла, што яны не даволі знаюць зямельнае заканадаўства, што нярэдка дапушчаюць у сваіх пастановах парушэньні законаў і распараджэньняў. Кваліфікацыя нізавых зямельных працаўнікаў нізкая, трэба-не падняць.

Асобая калегія у сваей рабоце вядзе барацьбу з падзелямі дробных сялянскіх гаспадарак і ўважае за лепшыя прысуджэньні сплат тым членам двара, якія ня могуць у ім жыць. Прымае належныя мерапрыемствы дзеля недапушчэньня самавольных захопаў зямлі, вызначыўшы скарочаны парадак разгляду зямельнымі камісіямі такіх спраў і абмяжоўвае абрэзку буйных гаспадарак толькі ў выпадках яе гаспадарчай мэтазгоднасьці.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту прызнаў працу зямельнага суду здавальняючай. Складзена камісія дзеля падрыхтоўкі мерапрыемстваў для падняцьця кваліфікацыі працаўнікоў зямельных камісій узмацненьня іх структуры і арганізацыі сталай паміж імі сувязі.

ПАШЫРЭНЬНЕ ПРАВОЎ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЕ ІНСПЭКЦЫІ.

Прэзыдыум ЦВК прыняў, унесеную Савнаркомам БССР, пастанову аб пашырэньні праў РСІ з мэтаю няўхільнага праведзеньня рэжыму эканоміі, змаганьня з безгаспадарчасьцю, бюракратызмам і валакітаю.

Прызнана канчатковымі і абавязковымі для выкананьня ўсімі дзяржаўнымі ўстановамі і прадпрыемствамі пастановы Народнага Камісарыяту Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі БССР па наступных пытаньнях: аб спрэчканьні і скарачэньні падліку і справаздачнасьці; аб ліквідацыі лішніх ворганаў і прадстаўніцтва; аб скарачэньні лішніх штатаў, аб зьмяншэньні накладных выдаткаў; аб змене структуры паасобных частак устаноў і прадпрыемстваў і аб выкладальні дысцыплінарных пакараньняў, а таксама аб адстаўленьні і звальненьні службовых асоб за відавочную безгаспадарчасьць, бюракратызм і валакіту.

Павысім садова-гародную культуру.

Садова гародная культура ў нас вусім нізкая. Збыт прадуктаў садавіны і гародніны ў сьвежым відзе не арганізаваны. Стаіць слаба ці амаль зусім не арганізована тэхнічная перапрацоўка садова-гародных прадуктаў, тады, як у многіх мясцовасьцях ёсьць шмат лішкаў іх.

Арганізацыя тэхнічнай перапрацоўкі садавіны і гародніны і выраб розных прадуктаў, як, напрыклад: фруктовага песта (пюрэ), пасьцілы, варэньня ды іншых фабрыкатаў, урэшце, удасконаленая сушка, могуць у значнай ступені выкарыстаць мясцовыя запасы сыроў і даць на замежны і ўнутраны рынак тавар, у якім адчувацца патрэба.

Апроч гэтага, разьвіцьцё экспорту садавіны і гародніны на базе тэхнічнай перапрацоўкі вельмі неабходна. У зьвязку з гэтым НК Гандлю БССР лічыць патрэбным правесьці пэраг мер па рацыянальнай арганізацыі тэхнічнай перапрацоўкі ў першую чаргу ў тых раёнах, дзе ёсьць лішкі прадуктаў ад садоў і гародаў. Да гэтых мер належаць: увоз замежнага абсталяваньня; камандыроўкі за межы нашых спэцыялістаў і запрашэньне да нас замежных тэхнікаў; дапамога ў атрыманьні крэдыту на арганізацыю тэхнічнай перапрацоўкі і, урэшце, выдача ліцэнзій на ўвоз рэнтабельных тавараў (цытрыны, апэльсыны) толькі тым арганізацыям, якія прымуць удзел у экспорце як непасрэдна, так і праз асноўных экспарцёраў.

Каб арганізаваць тэхнічную перапрацоўку садавіны і гародніны і, наогул, павысіць культуру, усе загатоўчыя арганізацыі павінны апрацаваць і падаць у НК Гандлю наступныя матар'ялы: сьпіс чынных і кансэрваваных прадпрыемстваў па тэхнічнай апрацоўцы прадуктаў, а таксама свае думкі адносна рэарганізацыі, да абстаяваньня і пашырэньня іх; пляны будаўніцтва новых прадпрыемстваў на 1996-27 год і на 1927-28 год, і колькі патрэбна на гэта сродкаў

У сваю чаргу, НК Гандлю прыступае да складаньня 5-цігадовага перспэктыўнага пляну разьвіцьця тэхнічнай перапрацоўкі садавіны і гародніны.

Усе матар'ялы з месц павінны накіроўвацца абавязкова ў НК Гандлю БССР.

Гаспадарчае жыцьцё ў акругах.

(Па матар'ялах акрпляну).

ПРЫВАТНЫ КАПІТАЛ У ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ ВІЦЕБСКАЕ АКРУГІ.

У 6221 прыватных прамысловых і саматужных прадпрыемствах акругі, працуе 8248 чалавек, з якіх наёмных рабочых толькі 1205 чалавек.

Валавая выпрацоўка прыватнай прамысловасьці акругі за мінулы гаспадарчы год складала арыентыровачна 8435000 руб., прычым даход выяўляецца ў суме 3449000 руб., ці 40,9 проц. выпрацоўкі. Чыстае накапленьне—344000 руб.—4,1 проц. кошту валавой выпрацоўкі.

Пераважнае месца прыватная вытворчасьць займае ў хлебапякарнай, мукамольнай і абуўнай вытворчасьцях. Значнае месца займае яна таксама ў скуранай і дрэваапрацоўчай вытворчасьцях.

Наліччa значных запасаў некаторых відаў сыр'я ў акрузе, пераапрацоўку якога ў бліжэйшы час дзяржаўная і каапэрацыйная прамысловасьць не здолее забясьпечыць, гаворыць за неабходнасьць далейшага разьвіцьця саматужнае прамысловасьці,

Віцебскі акрплян прызнаў неабходным запрапанаваць акруговаму саматужнаму саюзу ўзмацніць каапэраваньне саматужнікаў. Адначасова акрплян даў указаньні аб зьмяншэньні ролі прыватнага капіталу ў тых галінах вытворчасьці, у якіх яго дзейнасьць паслабляе тэмп разьвіцьця дзяржаўнай каапэрацыйнай прамысловасьці.

Неабходна імкнуцца да ізьняцьця з прыватных рук здадзеных ім у арэнду млыноў і рацыяналізаваць млынавую справу ў акрузе. Прызнана неабходным арганізаваць у райёнах дзяржаўную і каапэрацыйную маслабойную вытворчасьць.

У сувязі з разьвіцьцём будаўніцтва ў акрузе намечана арганізаваць у райёнах дзяржаўныя і каапэрацыйныя бэтонныя і асфальтовыя майстэрні.

ССУДА-АШЧАДНЫЯ ТАВАРЫСТВЫ Ў ГОМЕЛЬСКАЙ АКРУЗЕ.

У Гомельскай акрузе дзейнічаюць 6 таварыстваў, якія на 1 красавіка 1927 году яднаюць 1444 чал. Сводны балянс на гэты-ж лік дасягае 89165 руб.

Трэба адзначыць, што ў адносінах удзельнае вагі ўскладаў у балянсе і выдадзеных ссуд, ссуда-ашчадныя т-вы ў Гомельскай акрузе адстаюць ад астатняй часьці БССР.

Характэрна, што местачковыя т-вы, ня гледзячы на параўнаўча меншую дапамогу, якую яны атрымліваюць, наганяюць у разьвіцьці Гомельскае таварыства.

Гомельскі акрплян указаў на неабходнасьць разьвіцьця т-вамі, поруч з апэрацыямі па дастаўцы, і збытавыя апэрацыі. Акрплян прызнаў таксама неабходным павялічыць для іх разьмер крэдытаў, якія адпушчаюць ім банкі.

М.

„Правялі" экскурсію.

У нядзелю 19 чэрвеня рабочыя піваваранага заводу «Беларусь» з падшэфнікамі вайскоўцамі наладзілі экскурсію-пагулянку, з мэтай узмацненьня сувязі з падшэфнікамі і выкананьня пляну культпрацы на летні пэрыяд.

Рыхтаваліся да экскурсіі доўга. Шмат было патрачана часу на выпрацоўку пляну, каб як найлепей правесьці экскурсію.

Нарэшце, сабраліся.

Кожнаму рабочаму далі каня з сядлом, а жонкі паехалі на тачанках. З сабой набралі піва, харчу і інш.

Надвор'е спрыяла пагулянцы. Ехалі з натхненьнем. І чаму-б ня так, калі кожны ў сядле, з шашкай, стрэльбай, патронамі—вайсковыя і ўсё...

Але спачатку відаць было, што дадому пазьбіраюцца паасобку, а можа хто і без галавы—ну вядома ўсё можа траціцца з аружжам(?!)

Прыехаўшы «падпацаваліся», каб выканаць праграму лепей, і каб у сядле «мацней» трымацца.

У праграму ўваходзіла: сячы на поўным ходу, стральба і інш.

Распачалі. Але калі давялося пускаць у справу шаблі, дык у некаторых іх пры сабе ня стала, а ў іншых прычэплены ня там, дзе трэба.

У часе «атакі» бяз крыві не абышлося. Параненым застаўся конь, якому чуць не адсеклі вуха.

Пры стральбе на мішэнях раптам у небе зьявіліся галубы. Адразу дулы аружжа былі накіраваны ўгару, і страляніна па „жывых" распачалася. Стралялі з захапленьнем, цэліўся хто куды, і хто яго ведае чым-бы скончылася, але не хапіла патронаў.

Галубы засталіся жывымі.

Дадому вярталіся, хто калі. Некалькі коняў сталі ў двары заводу з паўдня, бо на невядомым прычынам іх часовыя гаспадары напрыяжджалі ў Менск а поўдні.—Відаць, за галубамі ганяліся...

Удзельнік.

„Ремесло г-на Кюрэ".

(Гастролі тэатру б. Корша).

Ня маючы асаблівае глыбокага зьместу і ня маючы прэтэнзіі на вялікае сацыяльнае значэньне, пьеса Ватэйля тым ня менш зьяўляецца для савецкага гледача вельмі цікавою і карысна выдзяляецца з шэрагу французскіх салёных камэдый сьвежасьцю і сучаснасьцю сьцёб тэмы, лёгкасьцю сваёй пабудовы. І гэтай нёсе аўтару удалося даць тэйлм. вострыя і травны малюнак з жыцьця пасьляваеннага французкага мяшчанства. Разбагацеўшым на вайне спекулянтам, якія адпалькава імкнуцца як да арыстакратычных тытулаў, так і да міністэрскіх партфоляў, да мыкарных пансіянтак, якія пралезьлі ў „вышэйшы сьвет" і да біскупаў, усёй гэтай брудной накіпі французкай пасьляваеннай буржуазеі, добра адчуваючы сябе ў атмасфэры фальшывасьці, пошласьці і адсутнасьці культуры, супрацьстаіцца, на ходу нёсеа, цэльная і самабытная фігура малядога Кюрэ, былога ўдзельніка вайны. Кюрэ—грубаваты і дабрадушны, але адначасова сумленны і разважлючы чалавек, які вынес з акопаў ня толькі знадворную салдацкую грубасьць, але і крытыкуючыя адносіны да грамадзкай ролі духавенства і гарачы пратэст проці буржуазнай сыстэмы сацыяльных суадносін.

Пасьля цэлага шэрагу скандальных—з мяшчанскага пункту гледжаньня—выхадак Кюрэ ўступае ў афіцыёўны канфлікт з церквою. Закліканы для дачы тлумачэньняў да біскупа, ён, пасьля гарачай выкрываючай прамовы, кідае апошняму ў твар сваю сутану і вязаўсёды пакідае з церквою.

Лёгка пабудаваная і ўмела дапасаваная п'еса прасякнута здаровым гумарам і дата-ж маючая шмат вельмі сьмешных станоўішч і сатырычных момантаў. Дзякуючы чаму п'еса лёгка ўсвайваецца і зьмест яе поўнасьцю даходзіць да гледача.

Вялікаму посьпеху на мала спрыяла тонкая і выразная ігра П. М. Радзіна, які даў выключна поўны і яскравы вобраз „пасьляваеннага" Кюрэ, грубаватага і простага, жыцьцярадаснага і дабрадушнага. але адначасна ляпрымірыма сумленнага е цьвёрдага ў сваіх пераконаньнях. Вельмі добра адыгралі свае ролі Шэтрова (м-м Кузіно), кульгарнай і распусной шансанэткі, выбражаючай сябе сьвецкай дамай, і Канавалаў (г-н Кузіно) пошлы, на вельмі разумны і нагла „пуварыш",

В-скі.

Фізкультура.

Узорная пляцоўка.

Зараз у садзе „Прафінтэрн" робіцца вялікая фізкультурная пляцоўка са ўсімі патрэбнымі прыладамі і станкамі. Пры пляцоўцы будзе абсталёвана разьдзявальня, душ і інш.

3.700 кілёмэтраў на вэлёсыпэдах.

Нізавыя фізкультурнікі, члены саюзу савецка-гандлёвых служачых, Сакалоў, Грахоўскі і Радушынскі на вэлёсыпэдах савецкай вытворчасьці робяць прабег Масква-Менск - Кіеў -Севастопаль -Харкаў - Масква, ўсяго 3.700 кілёмэтраў. Прабег Масква-Менск у 700 кілёмэтраў, ня гледзячы на дронную дарогу, вэлёсыпэды вытрымалі здавальняюча.

Менскія футбалісты выйгралі.

17-га ліпеня адбылося некалькі футбольных спатканьняў. Менскія футбалісты іграліз барысаўцамі, прычым перамога дасталася Менску з вынікам 5:1. Рачыцкія фізкультурнікі перамаглі мазырскіх з вынікам 5:1. Віцебскія футбалісты выйгралі ў полацкіх з выніку 4:3.

СУД.

„Добрая" цётка.

— Ты ў мяне будзеш жыць у тыся-у раз лепей, чымся дома,—гэткімі словамі сустрэла сваю пляменьніцу-сірату З. Нехля (Бабруйск).

— Я цябе буду карміць, адяваць, паіць,—сыпала далей свае абяцаньні цётка.

Пляменьніца Рахіль Л., 17-цігадовая вясковая дзяўчына, толькі прыехала ў горад. Бацькі яе памёрлі, і яна засталася адна. І вось тут на дапамогу прыйшла цётка.

— Прыяжджай, Рахіль. Знойдзем для цябе працу.

Не што, на што, а на „абяцанкі" цётка ня скупая.

— Рахілечка, заставайся ў мяне, буду табе плаціць на 10 руб. у месяц, а ты мне, старой, дапаможаш у гаспадарцы.

Другога выхаду ў Рахілі няма. Засталася.

Ужо на другі дзень забыла „добрая" цётка аб сваіх абяцаньнях.

Рахіль у яе працавала на 12 гадзін у суткі, карміла сваю пляменьніцу цётка астаткамі, аб адзеньні—і думаць ня прыходзілася.

Ну, ўсё роўна, як у „добрыя старыя часы" экспляватавалі вясковую дзяўчыну!

Рахіль цярпела.

Быў у цёткі сын Майсей.

Трымаў сын пякарню.

І пачаў сын скардзіцца матцы:

— Няма каму працаваць у пякарні.

У выніку Рахіль нагрузілі новай працай: яна стала дапамагаць у пякарні.

Сілы ня стала ў маладой дзяўчыны. Ні табе прысесьці, ні табе прылегчы... А ў дадатак—галодная: кормяць—кожны кавалак хлеба лічаць.

У дадатак Майсей зглядзіў сваю „прыслугу". Зглядзіў, а пасьля набрахаў матцы, што яна—владзейка, і дзяўчыну выкінуў на вуліцу.

Але за гэту справу ўзяўся пралетарскі суд.

Нагарэла і „добрай" цётцы за эксплёватацыю і сыну Майсею за зглядчаньне і вьдзекі.

Пралетарскі суд сказаў свае важкае слова.

— М. Нэхля прыговарэн на два гады зьняволеньня.

— З. Нэхля, „добрая" цётка аштрафавана на карысьць Рахілі ў 100 рублёў.

С—і.

СУДОВАЯ ХРОНІКА.

Панскі прыхільнік.

Пётра Шчасновіч пазнаёміўся з польскай дафрэйлінай і на яе загаду накіраваўся ў БССР зьбіраць весткі аб Чырвонай арміі ды інш. Першы раз яму ўдалося даставіць весткі, а за другім разам ён папаўся і сеў на лаўку падсудных. Менскі Акр. Суд прыгаварыў Шчасновіча на 7 год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем і пазбаўленьнем правоў; апрач таго, суд забараніў яму праживаць у прымежнай паласе (за 300 вёрст).

Адчыніла дом распусты.

У Менску на Камунальнай вуліцы ў невялічкім доміку Кацярыны Лапшыной па вечарох і ўночы ведьмі часта чутны былі крыкі п'яных галасоў, Лапшына „знаёміла" ў сваім доміку мужчын з прастытуткамі і зарабляла на гэтым. Справа Лапшыной была выкрыта, і яна папала на лаўку падсудных. Менскі Акруговы Суд прыгаварыў Лапшыну на тры гады зьняволеньня ўмоўна.

ХРОНІКА.

ПАЛАЖЭНЬНЕ АБ МЯСЦОВЫХ ФІНАНСАХ.

Саветам Народных Камісараў прынята і пададзена на зацьверджаньне ЦВК Палажэньне аб мясцовых фінансах БССР. Гэтым законам у першы раз устанаўляюцца сталыя і дакладныя асновы, на якіх будуць грунтавацца мясцовыя фінансы, устаноўлена дакладнае разьмеркаваньне даходаў і выдаткаў паміж асобнымі бюджэтамі і г. д.

500.000 РУБ. НА КАНАЛІЗАЦЫЮ ГОР. МЕНСКУ.

Зроблен дагавор з Белкамунбанкам на одпуск даўгатэрміновай пазыкі ў суме 500.000 руб. на каналізацыю г. Менску.

Водпуск пазыкі банк пачне ў хуткім часе.

Дзе зараз здымаюць «Калінаўскага»?

Экспэдыцыя, якая здымае „К. Калінаўскага", выехала ў м. Новы-Двор (12 вёрст ад Менску), дзе здымае галоўныя моманты з дзейнасьці выдатнага беларускага рэвалюцыянэра. У здымках фільмы ўдзельнічае шмат мясцовых сялян.

З Масквы прыедзе экспэдыцыя народазнаўства.

Гэтымі днямі з Масквы мае прыехаць у Менск экспэдыцыя цэнтральнага музэю народазнаўства. Экспэдыцыя паедзе з Менску па двох напрамках: 1) на Палесьсе для дакладнага вывучэньня аколіц Князь-возера з абхватам райёну Случы і 2) у Віцебскую акругу, дзе будзе вывучаць Межанскі і Азярышчанскі райёны.

Сады для дзяцей.

У Менску зараз існуе 14 дзіцячых садоў. Распрацаваны новыя правілы для прыёму дзяцей у гэтыя сады. У першую чаргу ў сады будуць прымацца дзеці з ясьляў, пасьля дзеці работнік, якія заняты на працы. Прыём у сады распачнецца 22 жніўня.

Як аддаць дзіця ў Інстытут разумова-адсталых дзяцей.

У інстытут разумова-адсталых дзяцей у першую чаргу прымаюцца дзеці з дзіцячых дамоў, а пасьля—прыватных грамадзян. Прымаюцца дзеці ва ўзросьце ад 7 да 10 год включна. Да заявы неабходна далучыць дакументы: а) копію матрыкі ці пасьведчаньня аб узросьце; б) спраўку ад прафсаюзу, членам якога зьяўляецца бацька ці маці; в) медыцынскае пасьведчаньне аб становішчы здароўя і г) кароткую характарыстыку дзіцяці, асабліва калі яно з дзіцячага дому.

Заявы аб прыёме дзіцяці ў інстытут можна падаваць з 15 ліпеня да 15 жніўня г. г. Правілы прыёму ў інстытут разумова-адсталых ёсьць на ўсіх інспэктарытах наробесьвіты БССР. За ўсімі спраўкамі належыць зьвяртацца ў кансультацыю інстытуту (Віцебск, вул. Урыцкага, № 13).

Замест трохдзеньніка—месячнік.

ЦК Дапамогі Дзецям пастанавіў замест трохдзеньніка на барацьбе з бясьпрытульнасьцю правесьці месячнік. Зараз распрадоўваецца плян правядзеньня гэтага месячніка. Пастаноўлена правесьці скарбоначны збор і ажыцьцёвіць шэраг іншых канкрэтных мерапрыемстваў.

Курорты на Беларусі.

У Менск вярнулася экспэдыцыя Інбелкульту, якая дасьледавала курортныя месцы БССР. Прэзыдыум Інбелкульту даручыў камісіі па вывучэньні прыродных сіл Беларусі зрабіць аналіз вады з некаторых крыніц Полаччыны. Па заключэньні камісіі, Баркаўшчанскія крыніцы і азёры павінны быць абʼяўлены курортамі рэспубліканскага значэньня.

Курсы бібліятэкараў.

У пачатку жніўня ў Менску будуць адчынены курсы для падрыхтоўкі і перападрахтоўкі бібліятэкараў. З Масквы запрашаецца спэцыяльны лектар.

Фонды клюбнага будаўніцтва.

ЦК саюзу працаўнікоў асьветы пастанавіла арганізаваць пры ЦК, акруговых аддзяленьнях і райвыканкомах спэцыяльныя фонды для пабудаваньня клюбаў. Перад ЦК саюзу ўзбуджана хадайніцтва аб водпуску 3000 руб. на ўтварэньне фонду пры ЦК.

Племянны рассаднік Менскага каапэрац. т-ва пташніцтва.

Рассаднік, заснаваны ў мінулым месяцы ва Ўрочышчы «Літонава» (каля Менску), распачаў працу па ўцягненьні ў яго пырокіх колаў сялянства па прынцыпах калектывізму.

Рассаднік, разьлічаны на одпуск селяніну таннага племяннога птаства для разводу, будзе мець некалькі тысяч пташкаў адведна ўмовам беларускай вёскі (глінабітныя, зямлянкі і з хворасту).

Апроч таго, рассаднік мае мэтай знаёміць ваколічнае насельніцтва з прыёмамі захаваньня і ўпакоўкі прадуктаў пташніцтва для экспорту, адборам племянных яек і вырашчваньнем маладняку.

Новыя аптэкі.

Сэкцыя аховы здароўя Менскага Гарадзкога Савету на сваім апошнім пасяджэньні пастанавіла дамагацца пашырэньня аптэчнай сеткі ў Менску. На акраінах гораду будуць адчынены дзьве новыя аптэкі.

Аднаўленьне мосту праз р. Сху.

Прэзыдыум Менскага АВК узбудзіў хадайніцтва перад СНК БССР аб водпуску 20.000 руб. на аднаўленьне разваленага ў часе навальніцы мосту праз раку Сху. Гэта сума будзе складаць 50 проц. усіх патрэбных сродкаў. Другія 50 проц. маюць быць уключаны ў бюджэт Барысаўскага гарсавету на 1927-28 год.

НАВУКА І ТЭХНІКА.

Процігаз у кішэні.

У канадыйскіх Здучаных Штатаў уводзіцца „кішэнны процігаз", ён мае выгляд невялікага пудзелка, напоўненага газаахвярлівочым матар'ялам. У час працы ён надзяваецца на рот і зачыняе нос.

Пішучая машынка для сьляпых.

У Амэрыцы прыдумалі пішучую машынку для сьляпых, яна мае ўсяго шэсьць клавіш і рэгулятар. Літары выцісканага шрыфту (складаюцца з камбінацыі кропак). Друкуюць на гэтай машыны „акордам" клавіш.

Рэкорд вышыні на гідрасамалёце.

Францускі лётнік Дэмугро паставіў новы сусьветны рэкорд на гідрасамалёце—ён падняўся на 9 кілёмэтраў у вышыню.

1.200.000 дзесяцін удобнай незаселенай плошчы.

У гэаграфічным т-ве атрыманы весткі, што ў паўднёвай частцы Енісейскага краю выяўлены вагромныя абшары [1.200.000 дзесяцін] невядомых да гэтага часу і ўдобных для засяленьня зямель.

Новыя багацьці ў Сібіры.

У Сібіры ў райёне Бадайбо знойдзены багацейшыя ў сьвеце заляганьні слюды. Па якасьці знойдзеная слюда шмат вышэй, чым індыйская, якая да гэтага часу лічылася найлепшаю.

Могілкі ў мураўёў.

Зоолёг Штэйнбэрг выявіў, што іншыя віды мураўёў складаюць трупы сваіх таварышоў у асобныя памяшканьні. Такія могілкі ён знайшоў на гарах у Швэйцарыі [Альпы].

Сываратка супроць яду гадзюк.

Аднаму амэрыканскаму доктару ўдалося знайсьці сываратку, якая адратоўвае ад сьмерці пакусаных гадзюкамі, нават такім ядавітымі як грамучая гадзюка, мядзянка [сьлівень], і іншыя макасінаў (вельмі ядавітая гадзюка, водзіцца ў Паўднёвай Амэрыцы]. Упушчаная ў кроў пакусанага чалавека, альбо жывёлы, нават праз некалькі гадзін пасьля пакусаньня яна адратоўвае ад сьмерці.

Сываротка гэта бярэцца з крыві коняй, якім прышчэплен яд равных гадзюк, спачатку ў малой дозе, затым усе ў большай і большай.

ШАХМАТЫ

№ 19 (119) 17-VII—1927 г.

Пад рэдакцыяй А. Каспэрскага.

Эцюд А. Кубеля (з кнігі 150 эцюдаў).



Белыя выігрываюць.

Бел. Крg1, Кg6, п. а6.

Чорн. Крg4, Сb3, п.п. d7, е6.

Хроніка:

Гомель. Турнір-чампіянат закончыўся яскравай перамогай Малевіча, які выйграў усе 15 партый; далей Сраговіч+ 12 1/2, Бабіцкі+ 10 1/2, Эрэнбург+10, Грыгор'еў +9 1/2, Эльман+9, Эвентаў+8 1/2. У турніры прымалі ўдзел 16 ігракоў.

ЗАГРАНІЦАЙ.

Кешкемет (Вэнгрыя). Міжнародны турнір майстроў надыходзіць к канцу; першае месца забясьпечана Німцовічу, другое Алёхіну.

Лёндан. 18-VII пачынаюцца міжнародныя шахматныя спаборніцтвы.

Табліцы выйгрышаў 1-е Усебеларускае грашовае лётарэі дапамогі бяспрытульным дзецям, зьмешчаныя ў газ. «Савецкая Беларусь», будуць высылацца па атрыманьні 20 кап. паштовымі маркамі.

Апавяшчэньні.

У чацьвер, 21 ліпеня, а 7 гадзіне ўвечары ў залі пасяджэньняў Гарсавету (Плац Волі № 4, трэці паверх), адбудзецца **ПАСЯДЖЭНЬНЕ ПЛЕНУМУ МЕНСКАГА ГАРСАВЕТУ.**

Парадак дню: Даклад аб працы Акруговага Аддзелу Здароўя.

— У Беларускую школу сьляпых дзяцей (Менск, Савецкая, 13) прымаюцца дзеці (хлопчыкі і дзяўчаткі), зусім сьляпыя, ва ўзросьце ад 7 да 11 год.

Без дакумантаў дзеці ў школу ня прымаюцца.

За іншымі даведкамі зьвяртацца ў школу сьляпых.

Адказны рэдактар **М. КУДЗЕЛЬКА.**

ТЭАТР-ЦЫРК-КІНО

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.
Гастролі ансамбля Маскоўскага драм.тэатру б. Корша.
Аўторак, 17 ліпеня
„ТОРГОВЦЫ СЛАВОЙ". Кам. у 5 дз. Нівуа і Паньаль.

ЦЫРК пад маст. кіраўніцтвам **А. Г. КІССО.**
Аўторак, 19 ліпеня.
Вялікае прадстаўленьне. Удзельнічае ўся цыркавая труппа і гастролёры. 5 ЭРНАНІ—музычны акт. 2 ЧЫНКЧАНГ, вясёлыя кітайцы і інш.
Працяг чэмпіянату барбы.
Ідуць наступныя пары:
I. Рашучая схватка двух мацн. супр. АЛІ-МУХАМЭДАВА і ВАСІ БУРАВОГА; II. КОЛЯ КВАРЫЯНІ супр ЗБЫШКО-СТАНКЕВІЧА; III АЙВАЗАЎ супр. СЕКВЕРСКАГА; IV. ЯРОШ супр. САЛЬВІНІ.
Пачатак роўна а 9 гадз. веч., барбы—у 11 г. веч. Цэны—ад 25 к.
Адміністратар Н. НІКОЛЬ.
Пачатак а 9-й гадз. веч.

КІНО «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА». З аўторка, 19-га ліпеня. **„ХАНУМА"**—бытав. камэд. у 7 частках. Звыш праграмы—гастролі заслужанага артыста дзярж. акадэм. тэатраў Г. Г. Ге.

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ». З аўторка, 19-га ліпеня, новая загранічная фільма **„Первая любовь Джона"**—драма ў 7-х ч. Звыш праграмы—кіно-хроніка Савкіно № 82.

КНИГИ ПО ЖИВОТНОВОДСТВУ.
Проф. О. Кульнер—Кормленіе сельско-хозяйственных животных, 15 руб. в пер. Проф. А. Г. Белянский—Враги пчел. Описаніе врагов пчел и способов борьбы с ними. С 148 рис. 2 руб. А. Осипова—Доходное куроводство. Практ. руковод. к выгодному веденію кур. 60 рис. 90 коп. П. Васильковский—Промысловые животные. 75 коп. И. В. Марголис—Продукты животноводств. 1 р. В. Бойков—Коневодство. 1 руб. А. Степанов—Лечебник домашних животных. 3 руб. Д. Орлоў—Буквар животноводства. 50 коп. Проф. Г. И. Гурин—Общедоступный лечебник домашних животных. С 71 рис. 2 руб. Проф. Н. К. Кольцов—Генетика домашней курицы. С 115 рис. и 11 табл. в красках. 15 руб. Проф. П. Н. Кулешов—Частное животноводство. 1-ый том. Крупный рогатый скот. С 101 рис. 2 руб. II-й том. Коневодство. С 186 рис. 1 руб. 60 коп. III-й Овцеводство. С 162 рис. 3 рубля 50 коп. IV-й Свиноводство. С 80 рис. 3 руб. Проф. М. Ф. Иванов—Овцеводство, С 142 рис, 3 рубля.
Заказы на все имеющиеся на рынке книги по животноводству выполняются наложенным платежом немедленно. Составленіе, пополненіе и комплектованіе библиотек. Требованіе и деньги (можно марками) направлять по адресу: Москва, 155, Малая Бронная 10, помещеніе 3, «КНИЖНАЯ ПОЛКА».

ЛЮБУЮ КНИГУ
ПО ВСЕМ ОТРАСЛЯМ ЗНАНИЯ и ТЕХНИКИ, ЛИТЕРАТУРЫ и ИСКУССТВА
немедленно высылает наложенным платежом книжный магазин „КНИЖНАЯ ПОЛКА".
— РАЗЫСКАНИЕ и ВЫСЫЛКА РЕДКИХ и РАСПРОДАННЫХ ИЗДАНИЙ. —
Заказы и деньги адресовать: МОСКВА, 155, Малая Бронная, 10, помещение 3
„КНИЖНАЯ ПОЛКА". 5-6

Телеграфный адрес "ВЗАИМНОК"

БАЛАНС
Могилевского Общества Взаимного Кредита
на 1-ое июля 1927 года.

Общество открыло свои действия 16 марта 1926 года.
Капитал обеспечен 576 член. 323.900 руб.

АКТИВ

№№	Наименование статей	Сумма	
I	Касса и текущие счета	7 564	09
II	Ценности	1.314	03
IV	Учет и спец. текущ. счет под векс.	176.298	55
VI	Товаро-ссудные операции	34.927	69
VII	Корреспонденты	37.974	88
IX	Разные дебиторы	2.204	29
X	Имущество	2.320	41
XI	Протест. векс. и сомнительн. долги	680	30
XIII	Проц., комис. уплач. и др. потери	13.829	32
XIV	Тек. и проч. расходы	27.469	03
	БАЛАНС	304.582	59

ПАССИВ

№№	Наименование статей	Сумма	
I	Оборотный капитал	32.392	—
II